№№97–98
(2825–2826)

2 ліпеня 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
У сувязі са святамі і пераносам працоўнага дня на гэтым тыдні, на жаль, рэдакцыя не змагла падрыхтаваць два выпускі газеты.
Просім прабачэння!

БЛІЦ

Што можна зрабіць, каб парламенцкія выбары прайшлі без фальсіфікацый вынікаў галасавання?

Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, паэт:

— Нічога. Што б і хто ні рабіў, усё роўна сфальсіфікуюць вынікі галасавання. Без маны некаторым проста нецікава жыць.

Алена ЯСЬКОВА, старшыня жаночай партыі "Надзея", рашэнне аб ліквідацыі якой прыняў Вярхоўны суд Беларусі:

— Мне здаецца, што ў сённяшняй сітуацыі, калі амаль усё знаходзіцца пад кантролем дзяржавы, для таго, каб выбары прайшлі без фальсіфікацый, нічога зрабіць немагчыма. Мне асабіста з цяжкасцю верыцца, што ў нашай краіне могуць быць справядлівыя выбары, калі ўсё адпавядае не толькі нашаму заканадаўству, але і міжнародным нормам.

Валерый ФРАЛОЎ, генерал-маёр запасу:

— У нашых умовах — нічога. Я нават магу прыблізна ўявіць, як усё адбудзецца. З дэмакратаў зарэгіструюць чалавек 25. Двум альбо тром з іх "дазволяць" трапіць у Палату прадстаўнікоў. Прычым гэтыя людзі будуць думаць, што яны самыя разумныя, што змаглі абысці нават сваіх партыйных босаў. Не выключаю, што новаабраныя дэпутаты-апазіцыянеры нават уступяць у канфрантацыю з той часткай апазіцыі, якая не трапіць у парламент. І зноў будзе чарговы разлад у апазіцыйных колах...

Лявон БАРТЛАЎ, мастак:

— Для цікавасці можна зрабіць вялікую мішэнь і кідаць у яе дроцікі. Але гэта таксама нічога не зменіць.

Аксана ЦЕЛЯШУК, менеджэр:

— Правесці выбары на другой планеце, альбо запрасіць у якасці назіральнікаў іншапланецян, якіх нельга нічым спакусіць і падкупіць.

Валянцін АКУДОВІЧ, філосаф:

— Зрабіць нічога нельга, таму што машына па прадукаванні неабходных вынікаў наладжана настолько бліскуча, што патрэбны працэнт галасоў будзе зроблены нават без буйных і вельмі заўважных фальсіфікацый. На гэты вынік ужо сёння і днём, і ноччу працуе ідэалагічная машына дзяржавы.

Аляксей ЯНУКЕВІЧ, намеснік старшыні Партыі БНФ:

— Я лічу, што нічога немагчыма зрабіць. Пабудаваная сістэма, на жаль, не дае магчымасці пазбегнуць фальсіфікацый. Трэба мяняць Выбарчае заканадаўства і ўсю сістэму.

Сергей АЛЬФЕР, старшыня юрыдычнай камісіі Аб'яднаных дэмакратычных сіл:

— Змяніць кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь, а таксама органы, якія праводзяць даныя выбары — Цэнтральную камісію па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў. Іншых варыянтаў я пакуль не бачу.

Алесь ЛАГВІНЕЦ, памочнік экс-кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Мілінкевіча:

— Прызначыць у выбарчыя камісіі прадстаўнікоў ад усіх палітычных партый і экс-кандыдатаў.

Дазволіць вольна праводзіць сустрэчы ва ўсіх адкрытых пляцоўках і ва ўсіх школах — без усялякіх папярэдніх дазволаў, а проста праз уведамленні аб сустрэчах. Неабходна вольная магчымасць праводзіць сустрэчы і пікетаванні.

Магчымасць запісваць свае ролікі на дзяржаўным тэлебачанні і проста аддаваць свае ролікі ў эфір.

Магчымасць распаўсюджвання інфармацыі без перасцярогі быць затрыманым на пэўны час і без канфіскавання ўлётак.

Магчымасць для назіральнікаў прысутнічаць на ўсіх пасяджэннях выбарчых камісій.

Магчымасць ад самага пачатку атрымліваць інфармацыю пра колькасць выбаршчыкаў на кожным выбарчым участку (я падкрэсліваю — менавіта на кожным участку).

Адмена датэрміновага галасавання без пісьмовага пацвярджэння неабходнасці гэтага.

Магчымасць для назіральнікаў атрымліваць любую інфармацыю ад выбарчых камісій, паколькі гэта нідзе не забаронена законам.

Магчымасць бачыць, што рэальна пазначана на выбарчых бюлетэнях. І таксама магчымасць пры патрэбе (у прысутнасці, безумоўна, прадстаўнікоў улады) пералічваць назіральнікам вынікі галасавання.

Таксама абавязковая магчымасць апублікавання спісу прагаласаваўшых па кожным асобна ўзятым участку (цяпер Цэнтрвыбаркам адмаўляецца паведамляць гэтыя звесткі).



ПАСТСКРЫПТУМ

Кардынала Бертоне ў Мінску суправаджалі два афіцэры Службы бяспекі беларускага прэзідэнта

Як вядома, з 18 па 22 чэрвеня з афіцыйным візітам у Мінску знаходзіўся Дзяржаўны сакратар Яго Святасці Папы Бенедзікта XVI кардынал Тарчызіо Бертоне. Святар прыляцеў у Мінск спецрэйсам у суправаджэнні двух ахоўнікаў і ўласнага сакратара.

Амаль увесь час знаходжання ў Беларусі кардынала апекаваў пасол Беларусі пры Святым Пасадзе Сяргей Алейнік. Да высокага госця дадаткова прыставілі двух ахоўнікаў — афіцэраў Службы бяспекі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Ніякіх эксцэсаў за пяць дзён знаходжання на беларускай зямлі дзяржсакратара Бенедзікта XVI не адбылося.

Што да запрашэння Бенедзікту XVI наведаць Беларусь, якое агучыў Аляксандр Лукашэнка, то яснасці пакуль няма. Падчас прэс-канферэнцыі кардынал Бертоне адзначыў, што Папа Рымскі "атрымлівае вялізную колькасць запрашэнняў з краін Еўропы, Афрыкі і Азіі". Кардынал Бертоне паабяцаў садзейнічаць ажыццяўленню візіту Папы ў Беларусь, аде дадаў: "Я не магу вызначыць час".

Некаторыя беларускія эксперты выказалі меркаванне, што не ўсё ў дадзеным пытанні залежыць ад Ватыкана. Нягледзячы на афіцыйнае запрашэнне Аляксандра Лукашэнкі, пытанняў застаецца шмат. У свой час Лукашэнка афіцыйна запрашаў у Беларусь і Яна Паўла II, аднак пантыфік да Беларусі так і не даехаў. Па некаторай інфармацыі, прыезд каталіцкага лідэра ў Беларусь не вітала Руская праваслаўная царква.

Дарэчы, у адрозненне ад Яна Паўла II, які ажыццяўляў да 20—30 візітаў у год, Бенедзікт XVI наведвае ў сярэднім 2—3 краіны.

Напярэдадні візіту Бертоне некаторыя беларускія аналітыкі выказвалі меркаванне, што адна з галоўных прэферэнцый, якую Беларуская каталіцкая царква чакае ад візіту дзяржсакратара Яго Святасці, — падпісанне канкардату — пагаднення, якое рэгулюе прававое становішча Касцёла ў краіне. Кардынал Бертоне заявіў, што казаць пра змест пагаднення яшчэ рана, бо дыялог толькі пачаўся.

І апошні цікавы факт, які заўважылі журналісты. Падчас прэс-канферэнцыі дзяржсакратара Яго Святасці былі распаўсюджаны матэрыялы для прэсы, падрыхтаваныя прэс-службай прэзідэнта Беларусі, у якіх сцвярджалася, што, згодна з сацыялагічным даследаваннем БДУ, у Беларусі пражывае толькі 9,3 працэнта каталікоў. Хаця да сустрэчы Тарчызіо Бертоне з Аляксандрам Лукашэнкам дзяржаўная прэса, спасылаючыся на звесткі апошняга перапісу насельніцтва, сцвярджала, што ў Беларусі 14 працэнтаў каталікоў.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

Савет Еўропы хоча назіраць за выбарамі ў Беларусі

Старшыня Камітэта міністраў Савета Еўропы, кіраўнік МЗС Швецыі Карл Більд заклікаў беларускія ўлады дазволіць прысутнасць на вераснёўскіх парламенцкіх выбарах еўрапейскіх назіральнікаў, а таксама правесці гэтыя выбары свабодна і дэмакратычна.

З такім заклікам спадар Більд выступіў на сесіі Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы. Ён паведаміў, што мае намер кансультавацца з калегамі з АБСЕ і Еўрасаюза, як паспрыяць таму, каб выбары ў Беларусі сапраўды былі свабоднымі і справядлівымі.

Старшыня Камітэта міністраў Савета Еўропы выказаў спадзяванне, што Беларусь хутка прыйдзе да дэмакратычных перамен, што дазволіць гэтай краіне заняць годнае месца ў Савеце Еўропы.

ВЫБАРЫ-2008

Алена СКРЫГАН: «Хоць нейкі, ды вынік»

Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ аб прызначэнні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу на 28 верасня гэтага года.

Акрамя таго, падпісаны дэкрэт "Аб членах Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў з правам дарадчага голасу пры правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу чацвёртага склікання", які прадугледжвае прадастаўленне палітычным партыям права накіроўваць у Цэнтральную камісію па адным члене камісіі з правам дарадчага голаса.

"На мінулых парламенцкіх выбарах я таксама была членам ЦВК з правам дарадчага голасу, — кажа сакратар ЦК Партыі камуністаў Беларускай Алена СКРЫГАН. — І тады перад намі стаяла адна ўмова. Члены камісіі з правам дарадчага голасу прызначаліся толькі пасля таго, як быў зарэгістраваны хаця б адзін кандыдат ад іх партыі. Ужо прайшоў збор подпісаў, некаторым кандыдатам адмовілі — членамі камісіі станавіліся на вельмі познім этапе. І ўмяшацца ў справу ты мог толькі тады, калі Цэнтральная камісія ўжо прымала і разглядала скаргі. Дрэнна і тое, што члены камісіі з правам дарадчага голасу не маюць права галасаваць. Ім дазволена толькі выступаць. А гэтага недастаткова для паўнацэннага ўдзелу партый у выбарчым працэсе. Хоць магчымасць выказаць сваё меркаванне была. Ва ўсялякім выпадку на мінулых выбарах мы адстаялі палову людзей з нашай партыі, якіх акруговыя камісіі не зарэгістравалі. А гэта ўжо нейкі вынік".

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ПРОГНОЗ

Минсельхозпрод планирует собрать 8 млн тонн зерна

В 2008 году в Беларуси планируется собрать 8 млн тонн зерна. Об этом недавно сообщил журналистам заместитель министра сельского хозяйства и продовольствия Василий Павловский.

По его словам, этот прогноз соответствует положениям программы возрождения и развития села. "Речь идет о 8 млн тонн зерна, 8,7 млн тонн картофеля, 3,7 млн тонн сахарной свеклы. Все сделано для того, чтобы получить прогнозируемые объемы", — подчеркнул замминистра.

Заместитель министра также отметил, что в 2008 году в Беларуси предполагается собрать 1 млн тонн зерна кукурузы.

Аляксандр САСНОЎ: Пры гэтай уладзе нават пенсія сілавіка будзе вышэй за заробак урача

З 1 ліпеня падвысіўся заробак урачоў: на 25% для амбулаторна-паліклінічнага звяна і на 10% у стацыянарах. Былы міністр працы Аляксандр Сасноў лічыць, што і пасля гэтага ў Беларусі заробак медыкаў застанецца вельмі нізкім у параўнанні з заробкамі сілавікоў.

У Беларусі таксама пашыраны пералік медыцынскіх аперацый, выкананне якіх падлягае больш высокаму матэрыяльнаму стымуляванню. Эксперты і непасрэдна працаўнікі дадзенай галіны перакананы, што гэтыя падвышэнні медыцынскія праблемы не вырашаць.

"Працаўнікам усіх бюджэтных арганізацый сталі нешта даваць апошнія гады — відаць, далей ужо няма куды было дзявацца. Да прыкладу, нават у Мінску вакансій медработнікаў, асабліва ў паліклініках, вельмі шмат. У першую чаргу ў нас матэрыяльна стымулявалі і стымулююць спецслужбы, вайскоўцаў, міліцыю і г.д. На дадзены момант нават пенсія сілавіка перавышае заробак урача або настаўніка. І гэта прапорцыя пры цяперашняй уладзе наўрад ці памяняецца", — упэўнены Аляксандр Сасноў.

Дзеля справядлівасці трэба зазначыць, што на ўсёй постсавецкай прасторы да бюджэтнікаў стаўленне не самае ветлівае ў плане іх матэрыяльнага стымулявання. Але ж кіраўніцтва Беларусі з 1994 года заяўляе, што будуе справядлівую ў сацыяльным плане дзяржаву.

Пры гэтым Сасноў лічыць, што падвышэнне заробкаў ніяк не адаб'ецца на дабрабыце медработнікаў, асабліва з улікам узроўню інфляцыі ў краіне. "Няўжо пасля гэтага ўрачы змогуць самастойна будаваць сабе жыллё? Не. Цяпер можна будзе абысціся без паднашэнняў або, калі сапраўды называць рэчы сваімі імёнамі, хабараў пры правядзенні тых жа складаных аперацый? Моцна сумняваюся. Нарэшце прафесія ўрача стане прэстыжнай і грашовай? Смешна", — кажа Сасноў.

Хірург адной з раённых бальніц Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці 33-гадовы Ігар П. салідарны з меркаваннем былога міністра працы.

"Ёсць вялікая асцярога, што пасля падвышэння ў нас могуць забраць надбаўкі за дзяжурства, сумяшчэнне ставак і гэтак далей. Таму як бы не праслязіцца ад новага разліковага лістка... Асабіста я наогул не ведаю, ці трапляю пад катэгорыю працаўнікоў, якім прызначаны надбаўкі, бо на дадзены момант у асноўным я выкарыстоўваюся як дзяжурны хірург. Але нават калі ўсё будзе добра, то я атрымаю на рукі дадаткова 34 тысячы рублёў — мой аклад складае 340 тысяч рублёў. Праўда, я яшчэ дадаткова атрымліваю 0,75 свайго акладу, бо працую па сумяшчальніцтве дзіцячым хірургам. Ну і плюс даплаты за дзяжурства. Выходзіць нешта каля мільёна. Але гэта пры працы практычна за дваіх!" — кажа практыкуючы доктар.

Дарэчы, Ігар ужо 7 гадоў па выхадных займаецца рэалізацыяй рознага хадавога тавара — мыючых сродкаў, зубной пасты, туалетнай паперы...

Пры гэтым ён кажа, што не адчувае ніякага сораму. Шматлікія ягоныя калегі нехаця сталі карабейнікамі, каб забяспечыць свае сем'і. Па меркаванні Ігара, яны наўрад ці расстануцца са сваім "прырабаткам" і пасля падвышэння зарплаты.

"Беларускі партызан".

3 ліпеня — Дзень вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, які з 1996 года святкуецца ў нашай краіне і як Дзень незалежнасці

Дарэчы, у гэтым годзе са святам адбыўся невялікі казус. Адзін з "вялікіх сяброў" нашай краіны — прэзідэнт Ірана Махмуд Ахмадзінежад схітрыўся павіншаваць Аляксандра Лукашэнку і ўвесь беларускі народ са святам 2 чэрвеня — на месяц раней, чым пачаліся ўрачыстасці.

Але ў любым выпадку свята ёсць свята. І давайце сустрэнем яго з надзеяй на сапраўдную незалежнасць і вызваленне! Беларусь павінна быць і будзе вольнай еўрапейскай краінай!

Народная Воля http://www.nv-online.info
2 ЛІПЕНЯ 2008 г.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Цэліў у Мілінкевіча, пакаралі — за Жаляпава

Сябра Нацыянал-бальшавіцкай партыі Аляксей Мітрафанаў, які шпурнуў у Мілінкевіча два яйкі на Смаленскім кірмашы ў Віцебску, аштрафаваны на 70 тысяч рублёў.

Заяву ў міліцыю пра інцыдэнт, які адбыўся 23 мая, напісаў каардынатар віцебскага абласнога камітэта па стварэнні руху "За Свабоду" Хрыстафор Жаляпаў.

Разбітымі яйкамі аказалася выпэцкана менавіта ягонае адзенне, хаця студэнт 4-га курса гістарычнага факультэта ВДУ Аляксей Мітрафанаў адразу заявіў, што цэліў у Мілінкевіча. Той сустракаўся ў той дзень на кірмашы з жыхарамі горада і прадпрымальнікамі — калегамі палітвязня Сяргея Парсюкевіча.

Аднак на суд над хуліганам, які прадставіўся прыхільнікам НБП, Хрыстафора Жаляпава не запрасілі. Пра тое, што Аляксей Мітрафанаў пакараны, Хрыстафор Жаляпаў даведаўся са SMS-паведамлення, дасланага самім аштрафаваным. У ім гаварылася: "Мне далі дзве базавыя велічыні штрафу, іх я заплачу. Але ці не сорамна вам за ваш паклёп? Вы ж ведаеце, што ў вас я яйкамі не кідаў".

Хрыстафор Жаляпаў не лічыць, што Аляксея Мітрафанава можна назваць ахвярай паклёпу, бо гэты чалавек свядома здзейсніў хуліганскі ўчынак. Паводле меркавання віцебскага актывіста, суд мусіў паставіцца да гэтага здарэння больш сур'ёзна, бо інцыдэнт мае пад сабой палітычную глебу.

Таксама спадар Жаляпаў лічыць парушэннем тое, што яму не паведамілі пра судовае рашэнне і што пра вынік разбіральніцтва ён даведаўся з тэлефоннага паведамлення таго, на каго скардзіўся.

У армію — праз псіхдыспансер?

Актывіста маладзёжнай арганізацыі "Грамадзянскі форум" Арцёма Забарына паклалі на абследаванне ў Мінскі псіхдыспансер пасля таго, як ён не захацеў стаць "стукачом".

"Напачатку мяне выклікалі ў ваенкамат, — расказвае Арцём карэспандэнту "Народнай волі". — Быццам бы на нейкі тэст. Там ужо чакалі прадстаўнікі органаў дзяржаўнай бяспекі. Падчас "тэсту" пачалі распытваць мяне аб паездках у Грузію, з якімі арганізацыямі супрацоўнічаю, аб праграме Кастуся Каліноўскага... Умова была такая. Ты, маўляў, нам усё гэта дакладваеш, а мы нічога не раскажам ваенкому, што ты ўжо не вучышся ў Беларусі і, такім чынам, праблем з арміяй не будзе. Я на ўсе пытанні адмовіўся адказваць, пасля чаго мяне адправілі на медкамісію. А пасля яе — у псіханеўралагічны дыспансер. І тут гісторыя зноў прадоўжылася. Загадчыца аддзялення задавала прыкладна тыя ж пытанні, што і супрацоўнікі КДБ. І вось з 13 чэрвеня знаходжуся ў псіхдыспансеры. Рабілі кардыяграму сэрца (у мяне ёсць з ім праблемы), абследавалі мазгі, невядома навошта прызначылі нейкія працэдуры... І пастаянна пытаюцца: "Як ты адносішся да арміі? Хочаш туды ці не?" Я не магу разабрацца ў іх пытаннях, хоць чаго яны хочуць, здагадацца можна.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

«Белая Русь» правядзе з'езд толькі пасля парламенцкіх выбараў

Як паведаміў намеснік старшыні праўладнага грамадскага аб'яднання, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Аляксандр Шацько, з'езд арганізацыі плануецца правесці ў кастрычніку гэтага года, пасля парламенцкіх выбараў. Такім чынам, праект стварэння арганізацыі, якая б актыўна падтрымала ўладу на парламенцкіх выбарах, не ўдаўся.

Нагадаем, што нядаўна Аляксандр Лукашэнка выступіў з рэзкай крытыкай таго, як людзей заганяюць у шэрагі арганізацыі. Пасля гэтага дата правядзення з'езда некалькі разоў пераносілася, а ў выніку ён увогуле пройдзе ажно пасля таго, як будзе сфарміраваны новы парламент.

І ўсё ж Аляксандр Шацько сцвярджае, што "члены РГА "Белая Русь" маюць намер прыняць актыўны ўдзел у маючай адбыцца выбарчай кампаніі, многія будуць балаціравацца ў Палату прадстаўнікоў шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў. Акрамя таго, члены грамадскага аб'яднання плануюць працаваць у складзе акруговых выбаркамаў, а таксама ў якасці нацыянальных наглядальнікаў прысутнічаць на ўсіх выбарчых участках".

Па неафіцыйнай версіі, вакол аб'яднання ідзе супрацьстаянне некалькіх прыўладных груповак.

ДИСКУССИЯ

Как МВД борется с теми, кто покупает секс-услуги?

Министр внутренних дел Беларуси Владимир Наумов предлагает ввести в белорусское законодательство административный арест за занятие проституцией.

По действующему законодательству за занятие проституцией предусмотрен штраф.

"И это приводит к тому, что женщины вынуждены более интенсивно заниматься этой работой", — говорит **Владимир Наумов**.

Отвечая на вопрос о личном отношении к легализации проституции, Наумов ответил: *"Если ее легализовать, то надо легализовывать и пьянство, и другие пороки, а у нас моральные устои и так не очень высокие".*

Как сообщают информационные агентства, экс-директор Купаловского театра, депутат Палаты представителей **Геннадий Давыдько** предлагает либо легализовать проституцию, либо начать бороться с ней серьезно: "Полумеры здесь неуместны".

"Я убежден, что проституция была, есть и будет, — заявил журналистам Давыдько, комментируя законопроект об ужесточении наказания за проституцию, который депутаты приняли в первом чтении. — Это как тараканы, которым две тысячи лет. Нужно легализовать этот незаконный бизнес, от которого деньги идут в уголовную среду".

Стоит отметить, что на одной из недавних пресс-конференций, где обсуждались в том числе и вопросы торговли людьми, министра внутренних дел Беларуси прямо спросили: как МВД борется с потребителями услуг секс-рабынь в Беларуси?

"Мы боремся, но не настолько с потребителями, потому что, как правило, на сегодняшний день ситуация складывается так: потребители в основном за пределами нашей республики, — ответил Наумов. — *А те потребители, которые в нашей республике, все рассказывают, что это было по обоюдному согласию. Если они оба договорились, то какое наказание? Когда мы задокументируем, что они даже после обоюдного согласия рассчитываются деньгами, тогда это будет состав административного правонарушения".*

ЭКСПЕРТИЗА

Андрей ПРАВДИН: «Если женщина хочет легально заниматься проституцией и платить налоги — это ее личное дело...»

Известный белорусский гинеколог Андрей Правдин считает, что для государства было бы крайне выгодно легализовать проституцию.

— Никто не отрицает, что у нас существует скрытая проституция, — говорит Андрей Витальевич. — Так почему не сделать ее контролируемой? На мой взгляд, если проституция будет легальной, то государство только выиграет от этого. Во-первых, будет происходить регулярное пополнение бюджета за счет немалых налогов, во-вторых — это жесткий контроль венерических заболеваний. Разве это плохо? В некоторых странах уже легализовали однополые браки, а у нас до сих пор ведутся споры о проституции.

— Что изменится, если проституток за их работу начнут сажать в тюрьму?

— С моей точки зрения, это нарушение прав и свобод человека. И я лично против этого. Если женщина хочет легально заниматься проституцией и платить налоги — это ее личное дело. А если будут сажать проституток... Силой еще никто не справлялся с подобными явлениями. А запреты мы уже проходили. И, как известно, чем больше запретов, тем плод слаще... Кстати, наличие любовников и любовниц — это ведь тоже своего рода проституция. И тоже иногда за деньги. Как тогда с этим бороться?

— Как думаете, стоит ли наказывать тех, кто пользуется услугами проституток?

— А зачем их наказывать? Если все происходит в нормальных условиях, если женщин никто не унижает, не берет их в рабство, не калечит, если люди занимаются этим по собственному желанию, пусть и за деньги, то зачем кого-то наказывать? В конце концов, это физиология. И во многих странах именно поэтому считается совершенно нормальным явлением посещение публичных домов — кое-где это даже входит в армейский устав. Потому что человек нормальной ориентации без удовлетворения своих сексуальных потребностей не будет творчески, с полной отдачей выполнять свои обязанности — ни в армии, ни где-то еще. Обратитесь к Фрейду — он был прав, когда писал, что человеком движут сексуальные желания. Другое дело, что сегодня надо воспитывать половую культуру. Но это, повторяю, мое личное мнение. Сомневаюсь, что оно кого-то будет интересовать...

Нина СТУЖИНСКАЯ: «Наказывать надо мужчину, который обеспечивает спрос...»

Председатель общественной организации "Белорусская женская лига" Нина Стужинская говорит, что ей очень симпатичен шведский опыт, где наказывают мужчин, обеспечивающих спрос на секс-услуги.

— Потому что до тех пор, пока будет спрос, будет и предложение, — объясняет свою позицию Нина Ивановна. — Но если будет введен административный арест за занятие проституцией, то он, повторяю, должен ограничивать не только продавцов секс-услуг, но и покупателей.

Если разрешить проституцию, то могут расцвести бордели чуть ли не через каждые два дома. Будет ли на них спрос? С одной стороны, учитывая сексуальность наших мужчин, наверное, нет: жены и любовницы не очень удовлетворены. А с другой — перед проституткой не надо стараться: заплатил деньги и получил то, что хочешь. Так что это сложный вопрос...

Вообще, я бы посоветовала чиновникам бороться не с проститутками, а с теми социальными причинами, которые заставляют белорусских женщин выходить на панель. Пусть посмотрят на реальное положение тех же студенток... Малообеспеченность, бедность, безработица — вот что толкает женщин на этот пусть. Я считаю, что чиновникам надо вначале об этом задуматься, а потом уже принимать крутые законы...

Марина КОКТЫШ.

СПЕЦИАЛЬНЫЙ РЕПОРТАЖ

Экскурс по вечерним отелям

Корреспондент "Народной воли" полюбовался вечером темными окнами пустующих минских гостиниц

В последнее время фешенебельные гостиницы стали плодиться в Минске, как грибы после хорошего летнего дождя. Относительно недавно в центре столицы открыт отель "Европа". Месяц назад приступила к работе турецкая гостиница "Growne Plaza". Главный архитектор города Владимир Никитин заявил, что на месте гостиницы "Беларусь" в Минске планируется возвести гостинично-деловой центр и деловой центр класса "А", в состав которого войдут развлекательный центр, бассейн, спортивные сооружения и даже вертолетная площадка на крыше. Строительство отелей планируется в районе Октябрьской площади, Национальной библиотеки, Червенского рынка... Подумалось, что все это, безусловно, очень неплохо, если в этих отелях есть кому жить. И я решил пройтись вечером по некоторым минским гостиницам.

22.15. Свой вояж начинаю со старой доброй гостиницы "Беларусь".

— Свободные места есть? — интересуюсь на "рецепции".

— Сколько угодно, — успокаивает меня девушка. — Гостиница заполняется только процентов на сорок.

Верю девушке на слово, но сам насчитываю с одной стороны отеля только 10 горящих окон. Хотя в ресторане людей прилично.

"Беларусь" — гостиница трехзвездочная, относительно недорогая. Для граждан из зарубежья сутки пребывания в номере стоят от 64 до 372 долларов. Для "эсэнговцев" в некоторых номерах эконом-класса на 5—10 долларов меньше.

Впрочем, судьба "Беларуси", кажется, уже решена. Мы уже писали, что более 350 сотрудников персонала минской гостиницы "Беларусь" подали в Администрацию президента письмо с просьбой разъяснить ситуацию о возможном сносе отеля. Ответ пришел, но не утешил.

"Ответное письмо по своему содержанию не выходит за рамки того, что мы услышали по телевизору, — рассказывают мне сотрудники "Беларуси". — Там было написано, что нас о каких-то конкретных шагах уведомят дополнительно. Но нашего разрешения, конечно, никто спрашивать не будет. То есть все осталось по-прежнему".

Далее мой путь следует до гостиницы "Юбилейная", что на проспекте Победителей. Такая же "трехзвездочная", как и "Беларусь". Цены здесь от 82 до 243 долларов в сутки. Эту гостиницу многие называют "спортивной", поскольку именно спортсмены обычно останавливаются в "Юбилейке" ввиду ее относительной дешевизны и близости к Дворцу спорта. Насчитываю уже по 20—30 горящих окон с обеих сторон здания.

"Загруженность средняя, — честно признается мне сотрудница "Юбилейной". — Сегодня, например, гостиница полупустая. Но если проходят какие-нибудь соревнования или конференция, то отель заполняют целые делегации. Но, повторюсь, обычно проблем с номерами нет".

Не обнаружил я в тот вечер проблем с номерами и в новом отеле "Европа". Из всех окон гостиницы тоскливо светились только два, в холле прохаживались несколько человек и сотрудники "Европы", в ресторанчике томно потягивала французское вино пара преклонных лет. Здесь самый дешевый одноместный номер стоит 265 евро, а самый дорогой (президентский "Люкс") — 1150 евро за сутки. Персонал "Европы" коротко поведал мне, что загруженность у них тоже "как когда".

В турецком отеле "Growne Plaza" (бывшая гостиница "Свислочь"), открывшемся месяц назад, со стороны улицы горящих окон и вовсе не обнаруживаю. То ли в одиннадцать вечера уже все спят, то ли гуляют по городу, то ли в гостинице просто нет посетителей. Здесь номера стоят от 210 до 715 евро.

"За этот месяц средняя загруженность у нас составила около 50 процентов, — радостно сообщают мне в отделе менеджмента отеля. — Июнь был довольно активным, поскольку было много выставок, и многие их участники останавливались у нас. "Growne Plaza" — отель для деловых людей и в основном именно на этот контингент рассчитан. А что касается того, что свет в гостиничных окнах не горит вечером... На мой взгляд, это не показатель загруженности отеля. Тем более что мы только начинаем свою работу".

Вот кто меня порадовал в тот вечер, так это гостиница "Минск". Излюбленное место многих эстрадных и спортивных "звезд" и знаменитостей. Именно здесь останавливался и выбрал себе невесту из числа официанток гостиницы арабский шейх; очень скоро, по нашей информации, здесь "приземлится" принцесса Монако.

"Мне ни к чему делать "приписки", но по загруженности мы уже практически выходим на 100 процентов, — говорит директор гостиницы "Минск" **Николай ЖУРАВСКИЙ**. — И это у нас почти система. Во всяком случае 80—90 процентов — объективная реальность. Из них 95 процентов наших клиентов — россияне и приезжие из дальнего зарубежья. И я вам скажу так: строительство новых гостиниц сегодня необходимо. Но подчеркну — хороших гостиниц. Потому что сегодня четырехзвездочные гостиницы "Минск" и "Виктория" практически полностью заполнены".

Одним словом, в тот вечер ситуацию для себя я почти уяснил. Хотя самый главный вопрос все же остался. Так ли сегодня нужны Минску дорогие, с претензией на пять звезд отели, если пустуют и ныне действующие?

Алесь СИВЫЙ.
Фото автора.

КОММЕНТАРИЙ ПО ДЕЛУ

Ярослав РОМАНЧУК, экономист:

— По большому счету, если в Минске строятся частные отели и люди вкладывают деньги, создавая новые рабочие места, то это неплохо. Развитие такой инфраструктуры нормально. Другое дело, что это делается с огромным опережением. Потому что такой гостиничный бизнес обычно развивается в странах, которые уже прошли определенный этап экономического развития, сделали реформы и где созрел спрос на такие отели. В маленькой Литве счет туристов идет уже на миллионы. У нас туристический бизнес пока "лежит". Не каждый турист захочет снимать номер в белорусской гостинице за 300 евро в сутки.

ГУЧНАЯ СПРАВА

А пракурор патрабаваў расстрэлу

Былыя абвінавачаныя па "машчаніцкай" справе выходзяць на волю

Днямі былі вызвалены з калоніі і вярнуліся дадому яшчэ два чалавекі, якія раней абвінавачваліся ў забойстве сям'і з шасці чалавек у вёсцы Вялікая Машчаніца. Нагадаем, што гэтае жудаснае злачынства, якое ў свой час ускалыхнула ўсю краіну, адбылося ў ноч з 31 мая на 1 чэрвеня 2005 года ў вёсцы Вялікая Машчаніца Бялыніцкага раёна.

Праз дзень былі затрыманы шасцёра маладых людзей ва ўзросце ад 18 да 24 гадоў, усе яны з'яўляліся ўраджэнцамі вёскі Машчаніца. Пяцярым з іх неўзабаве было прад'яўлена абвінавачванне ў забойстве. Расследаванне па справе цягнулася амаль паўтара года, адзінаццаць месяцаў ішоў судовы працэс у Магілёўскім абласным судзе пад старшынствам суддзі Міхаіла Мельнікава. У выніку судовага разгляду пракурор запатрабаваў для двух падазроных выключную меру пакарання — расстрэл, для іншых трох чалавек — пажыццёвае зняволенне.

Аднак 2 лістапада 2007 года судовай калегіяй Магілёўскага абласнога суда ўсім гэтым хлопцам у частцы абвінавачвання ў забойстве ў сувязі з недаказанасцю віны быў вынесены апраўдальны прысуд. Адзін з падсудных — Аляксандр Клепча — быў вызвалены з-пад варты прама ў зале суда. Астатнія пакараны рознымі тэрмінамі зняволення ад 4 да 10 гадоў за іншыя злачынствы: некалькі чалавек прызнаны вінаватымі ў сексуальных дачыненнях з непаўналетнімі, крадзяжах, адзін прызнаны вінаватым у згвалтаванні.

У лютым 2008 года адбылося пасяджэнне Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь, які ў сваім рашэнні поўнасцю зацвердзіў прысуд Магілёўскага абласнога суда, і маладыя людзі зноў прызнаны невінаватымі ў забойстве ў сувязі з недаказанасцю віны.

У выніку вызвалены з-пад варты ў Аршанскай калоніі Генадзь Салаўёў, а з Бабруйскай калоніі — Сяргей Юшкевіч. Абодва хлопцы адразу ж прыехалі да бацькоў у вёску Машчаніца. Аднаго з іх у свой час пракурор патрабаваў прыгаварыць да расстрэлу, другога — да пажыццёвага зняволення.

Тое, што хлопцы кажуць пра нашу міліцыю і метады яе працы, на газетнай паперы друкаваць нельга, але вы самі разумееце, паважаныя чытачы, што патрэбна зрабіць з людзьмі, каб дабіцца прызнання ў забойстве, якое яны не здзяйснялі...

Няма адказу і на галоўнае пытанне: хто забіў сям'ю з шасці чалавек, у тым ліку двух малых дзетак у вёсцы Вялікая Машчаніца, і чым займаецца наша міліцыя, калі яна вось ужо амаль тры гады не можа раскрыць гэта зверскае злачынства? Новыя вялікія зоркі на пагоны за гэты час паспела атрымаць амаль усё кіраўніцтва Бялыніцкага РАУС, незразумела толькі, за якія заслугі...

Іван БАРЫСАЎ.

ФОТАФАКТ



Актывіст незарэгістраванага "Маладога фронту" з Салігорска Павел Батуеў запатрабаваў ад ваенкамата беларускамоўную анкету прызыўніка. У атрыманым дакуменце ён выявіў больш за 100 памылак.

Народная Воля http://www.nv-online.info
2 ЛІПЕНЯ 2008 г.

СКАЗАНА!

Мікалай ЛАЗАВІК, сакратар Цэнтрвыбаркама:

— Ігнаруючы выбары, палітычныя партыі адмаўляюцца ад выканання сваёй галоўнай мэты — заваёвы ўлады... Законным шляхам уладу можна заваяваць толькі праз выбары, астатнія шляхі — незаконныя.

БЛІЦ-КАМЕНТАРЫЙ

Законным шляхам уладу можна заваяваць толькі тады, калі падчас парламенцкіх выбараў улады не будуць парушаць законаў

Шаноўны Мікалай Іванавіч!

Будзем шчырымі — скажыце, калі ласка, у сённяшніх умовах беларускай рэчаіснасці законным шляхам можна заваяваць уладу?

Калі нават дапусціць, што вынікі выбараў залежаць ад пазіцыі грамадскасці, то адразу ўзнікае пытанне: а хто і калі фарміруе грамадскую думку? Робіцца гэта, як вы ведаеце, не за тыдзень і не за месяц. І робіцца, не зважаючы на прынцыпы дэмакратыі, прынцыпы справядлівасці, якія акрэслены ў Канстытуцыі.

Добра было б, скажам, каб электарат меў магчымасць пастаянна знаёміцца з выказваннямі як тых кандыдатаў, на якіх робіць стаўку ўлада, так і тых, хто прылічваецца да ліку апанентаў улады. Але ж беларуская рэчаіснасць сведчыць, што ў прадстаўнікоў апазіцыйных сіл фактычна няма трыбун, з якіх яны маглі б данесці сваю пазіцыю да шырокіх мас. Скажыце, акрамя "Народнай волі", якую ўлады загналі аж у Смаленск, многа газет, якія прапаноўваюць свае старонкі дэмакратычным актывістам? Не, канечне. А ці маюць яны магчымасць выкарыстаць тэле- і радыёэфір? Адказ зразумелы — не. А калі і будуць прадстаўлены лічаныя хвіліны напярэдадні выбараў, то без цэнзарскіх ножніц не абыдзецца, гэта раз, а па-другое, паўздзейнічаць на грамадскую свядомасць за адзін дзень немагчыма.

Давайце, Мікалай Іванавіч, паглядзім на праблему і з іншага боку. Выбары могуць быць дэмакратычнымі толькі тады, калі на ўсіх стадыях працэсу захоўваюцца правы грамадзян самых розных светапоглядаў. Скажыце, чаму ў выбарчую камісію ўключаецца прадстаўнік праўладнай партыі камуністаў (КПБ) і не ўключаецца прадстаўнік Партыі камуністаў Беларускай, якую ўзначальвае апанент Лукашэнкі, добра вядомы ўсім Сяргей Калякін? Альбо: прадстаўнікам мясцовай вертыкалі ёсць месцы ў камісіях, а прадстаўнікам Партыі БНФ, Беларускай сацыял-дэмакратычнай, Аб'яднанай грамадзянскай партыі месца няма? Чаму, на якой падставе?

Мікалай Іванавіч, скажыце, даражэнькі, а як выйграць выбары, калі ўлады чыняць столькі перашкод для прадстаўнікоў апазіцыйных сіл, што ні ў голас расказаць, ні пяром апісаць. Хоча любімчык вертыкалі запрасіць выбаршчыкаў у самую вялікую залу — калі ласка, у любы дзень і ў любы час; звярнуўся з такой просьбай яго сапернік па выбарчай барацьбе — ад варот паварот.

У рэшце рэшт, як казаў адзін вядомы правадыр, не важна, як людзі прагаласуюць, важна, як будуць падлічаны іх галасы. А каб яны былі "правільна" падлічаны, назіральнікаў і блізка не дапускаюць да сталоў з бюлетэнямі. Нават члены камісій не заўжды ведаюць усё закулісе з падлікам галасоў.

Вось і паспрабуйце ў такіх умовах (а мы звярнулі ўвагу толькі на некаторыя моманты) заваяваць дэпутацкі мандат. На парламенцкае крэсла можна разлічваць толькі тады, калі тваё прозвішча трапіць у спіс тых прэтэндэнтаў, якіх падтрымлівае існуючая ўлада. А гэта ўжо не мае нічога агульнага з "заваяваннем улады законным шляхам".

Што, Мікалай Іванавіч, не так? Калі не згодны — Вам слова на старонках "Народнай волі".

ЧУЛІ?

У праекце на будучы год закладзены рост жыллёва-камунальных плацяжоў

У Беларусі кошт жыллёва-камунальных паслуг у 2009 годзе плануюць павысіць у эквіваленце на 20 долараў.

Пра гэта заявіла "Інтэрфаксу" крыніца ў органах дзяржкіравання са спасылкай на апошнюю рэдакцыю праекта бюджэту на наступны год.

Раней штогадовы прырост коштаў ЖКП складаў у эквіваленце 5 долараў. Аднак толькі за студзень-май 2008 года камунальныя выплаты падаражэлі больш чым на 10 долараў.

А як жа з абяцаннем А.Лукашэнкі не павышаць кошт жыллёва-камунальных паслуг у год больш чым на 5 долараў?

Аўтастоп!

Незаконную рэалізацыю ў Беларусі ў 2002—2007 гадах аўтамабіляў Hyundai расследуе Упраўленне дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю. У адносінах да кіраўніка карпарацыі, зарэгістраванай у Канадзе, распачата крымінальная справа.

Гэтага бізнесмена падазраюць у стварэнні разам з грамадзянкай Беларусі і яшчэ шэрагам асоб "устойлівай злачыннай групы", якая незаконна атрымала прыбытак на суму больш за 4 мільёны долараў.

Дадатковы рэйс на Маскву

Кампанія "Белавія" ўвяла дадатковы рэйс Мінск—Масква (Дамадзедава). Гэта другі штодзённы рэйс у аэрапорт Дамадзедава. Такім чынам, агульная колькасць палётаў паміж Мінскам і Масквой узрасла да пяці разоў на дзень.

Страшная статыстыка Мінска

У Мінску павялічваецца колькасць жанчын, якія церпяць ад раку малочнай залозы. Пра гэта паведаміў галоўны лекар гарадскога анкалагічнага дыспансера Зігмунд Гедрэвіч.

Толькі за апошнія пяць месяцаў 2008 года ўжо зарэгістраваныя 332 новыя выпадкі паталогіі.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Бои без правил

В 2005-м это уголовное дело стало сенсацией. Обвинение в распространении наркотиков было предъявлено начальнику управления по противодействию незаконному обороту наркотиков и преступлениям в сфере нравов криминальной милиции УВД Миноблисполкома полковнику Александру Тихомирову и двум его подчиненным — начальнику Борисовского межрайотдела по противодействию обороту наркотиков Сергею Шнейдеру и оперуполномоченному того же отдела Алексею Лебедку. О закрытом суде над "оборотнями в погонах" написали практически все государственные СМИ — это был хороший пример того, что государство борется с преступниками, невзирая на их звания. Однако, как нам стало известно, осужденные не признали своей вины и до сих пор добиваются отмены приговора и заведения уголовного дела по факту совершения преступления теми, кто это дело "лепил".

"Дело Тихомирова" рассматривал суд Жодино (позже — Минский областной суд). Тихомиров, Шнейдер и Лебедок были признаны виновными в незаконном обороте и хранении наркотических средств и прекурсоров, а также в превышении власти и должностных полномочий. МВД признало своих сотрудников виновными еще до решения суда, уволив всех из "органов" "в связи с заведением уголовного дела". Позже суд определил наказание: Тихомиров получил 13 лет колонии усиленного режима, Шнейдер — 10, а Лебедок — 8,5. Прямо скажем, приговор суровый.

Официальная версия следствия, которой поверил суд, такова. В феврале 2005 года сотрудниками КГБ был задержан автомобиль двух жителей Борисова, в котором был обнаружен кокаин и частично расфасованный амфетамин. Задержанные объяснили, что действовали по инструкциям некоего Райкевича. Есть такой деятель. Однако в суде он проходил только в качестве свидетеля. Основными обвиняемыми оказались Тихомиров, Шнейдер и Лебедок...

Интересно, что в милицейских кругах долгое время считалось, что полковник Александр Тихомиров был дружен с тогдашним председателем КГБ Степаном Сухоренко. Говорили даже о том, что дружат высокопоставленные деятели семьями. То ли "сарафанное радио" ошибалось, то ли неизвестная черная кошка пробежала между бывшими приятелями, но в итоге оказалось, что именно ведомство Сухоренко и провело операцию по разоблачению "оборотней в погонах".

В деле — полный набор обвинений: и замена наркотика сахаром или аскорбиновой кислотой, и продажа изъятых наркотиков, и помощь наркокурьерам в сбыте "дури"... Помимо этого — сознательное подтасовывание, завышение показателей раскрываемости преступлений, поскольку всегда можно было "взять с поличным" наркомана, который закупил дозу у подставных наркодилеров. "Утяжелило" дело Тихомирова и то, что при обыске у него дома были обнаружены: охотничье ружье ИЖ-56 "Белка", охотничьи карабины "Лось-7" и "Барс-4", пистолет Марголина МЦМ, патроны... Должным образом оформленных разрешений на все это, естественно, не было.

От первого лица

У бывших борисовских милиционеров другая версия произошедшего. В феврале 2005-го на них вышла женщина, которая сообщила, что давно негласно сотрудничает с полковником Тихомировым и что готова оказать помощь в задержании наркокурьера с крупной партией наркотиков. Естественно, борисовчане доложили по инстанции Тихомирову и получили указание: если информация стоящая — разрабатывать. О "спецоперации" в Борисовском межрайонном отделе по противодействию торговле наркотиками знали все более или менее значимые персоны, так что вряд ли можно предположить, что Тихомиров, Шнейдер и Лебедок замышляли некую операцию по собственному обогащению. Однако они почему-то не предположили, что могут стать "героями" так называемого "оперативного эксперимента", устроенного КГБ и именуемого в народе провокацией.

Вот как описывает свое задержание один из бывших милиционеров. "После того, как им не удалось спровоцировать меня на противоправные действия на первой встрече, они назначили вторую встречу. На ней я был задержан сотрудниками УБОПиК КГБ. На меня надели наручники, натянули на глаза шапку, кто-то начал лазить у меня по карманам. Я понял, что мне что-то подбросили. Возмущаться было бесполезно, нужно было думать, как избавиться от подброшенных предметов. Я прекрасно понимал, что во время обыска в присутствии понятых мои доводы о том, что все это мне подбросили, будут просто смешны. На вопрос "Что все это значит?" и сообщение, что о случившемся мне надо доложить руководству, я получил ответ: "Твоему руководству — конец, думай о себе, если не будешь давать нужные показания — загремишь лет на десять". После этого — в наручниках и с шапкой на глазах — меня посадили в машину КГБ, где в таком состоянии я пробыл минут сорок. Все это время меня беспокоила только одна мысль: как избавиться от подброшенного "сюрприза". В это время сотрудники КГБ "успешно" обыскивали мою служебную машину.

"Сюрприз" я обнаружил в кармане жилетки. Мне очень повезло, что они не положили "подарок" во внутренний карман — в него, будучи закован в наручники, я бы ни за что не добрался. Искомыми предметами оказались патрон от пистолета Макарова и полиэтиленовый пакетик с белым порошком (несложно догадаться, что с наркотиком). Как вы понимаете, когда дошла очередь до моего личного обыска, сотрудников КГБ ожидало разочарование... Дело в том, что до этого "подосланные граждане" пытались вручить мне взятку. "Всунуть" мне деньги они пытались безуспешно, потому потребовались боеприпасы и наркотик. Но вышел облом — все это упокоилось под задним сиденьем их же автомашины. Обыски дома и в рабочем кабинете тоже ничего не дали, но меня доставили в центральное здание КГБ в Минск, где я до ночи слушал байки оперов о том, как долго они вели мою разработку и что о моей деятельности они все знают. Мне было просто смешно: самое большое мое правонарушение — мог проехать на красный сигнал светофора. Да и о какой "усиленной разработке" может идти речь, если эти "спецы" даже не удосужились позвонить в адресное бюро и узнать, где я живу. Сначала они поехали с обыском на квартиру, где я жил десять лет назад".

Но главное: арестованным прямым текстом в присутствии адвокатов предлагали дать показания против полковника Тихомирова, а взамен обещали статус свидетелей по делу. Некоторые согласились. Шнейдер и Лебедок — отказались.

Чем же не угодил Тихомиров "коллегам из КГБ"? Высказываются разные версии. Одни вспоминают, что Александр Тихомиров в свое время возглавлял минский ОБЭП и хорошо попортил нервы многим весьма влиятельным в Беларуси лицам и их бизнес-партнерам. Другие обращают внимание на то, что деятельность милицейской службы по борьбе с незаконным оборотом наркотиков и аналогичного подразделения в КГБ неизменно ведет к конфликтам: работают-то на одном поле, правда, каждый по своим планам и за свои показатели, а значит, борются не только с наркодельцами, но и друг с другом.

«Зачем закон, если было указание руководства?»

Скажем сразу: на суде задержанные наркокурьеры признались, что оговорили милиционеров под давлением сотрудников КГБ. Молодая женщина, у которой двое несовершеннолетних детей, одному из которых на момент всей этой истории было чуть более месяца, готова была на все, лишь бы ее отпустили к детям. Ее попросили дать "правильные показания" и, действительно, на время отпустили... Чтобы использовать в так называемом оперативном эксперименте, а потом судить.

Однако всех этих доводов никто уже не услышал. Потому что суд был закрытым, хотя дела по торговле наркотиками никак не могут относиться к тем, которые содержат государственную тайну. Но, вероятно, ни следствие, ни прокуратура, ни суд просто не хотели иметь зрителей на таком процессе. Адвокаты, кстати, характеризуют его цитатой из показаний одного из сотрудников КГБ. Рассказывают, что когда удивленный судья задал ему риторический вопрос: "А как же закон?", ретивый службист ответил: "Зачем закон, если было указание руководства?.."

Во время суда, кстати, выяснилось и еще одно интересное обстоятельство... Наркотики "агентам Тихомирова" были проданы с подачи КГБ, потом эти самые наркокурьеры этой самой службой были задержаны, а к суду изъятые наркотики... исчезли. В общем, ровно та самая схема, в которой КГБ обвинил Тихомирова и его подчиненных. Немногочисленным участникам процесса забавно было наблюдать, как удивленные судья и гособвинитель лично убедились, что доставленные в суд "вещественные доказательства" — злополучная партия амфетамина оказалась совершенно не той, описание которой фигурирует в протоколах изъятия. По необъяснимой причине она подверглась "усушке-утруске" и переупаковыванию. Уж не знаю, досыпали ли в конфискованный героин сахар или аскорбиновую кислоту, но тот факт, что кто-то, как говорится, отсыпал наркотиков на некие нужды, в суде всплыл. Но это было просто... проигнорировано.

Правда, судом было вынесено частное определение о возбуждении уголовного дела по части 1 статьи 426 Уголовного кодекса в отношении одного из следователей КГБ, однако дальнейшего развития история не получила. Известно только, что разрешение на выдачу изъятого амфетамина из запасников КГБ давал лично тогдашний председатель КГБ Степан Сухоренко. Просил его об этом в специальном рапорте начальник 3 Управления КГБ РБ М.П.Михолап. Почему полковнику Михолапу для оперативного эксперимента понадобились именно наркотики, изъятые у наркокурьеров (дефицит их что ли в нашей стране?), — непонятно. Но фактом остается то, что до суда столь важные вещественные доказательства в целости и сохранности "не дожили". Осужденные милиционеры сегодня добиваются возбуждения по данному факту уголовного дела, поскольку вся эта история может способствовать разматыванию большого клубка фальсификаций, в том числе и по "делу Тихомирова". Однако Генеральная прокуратура стоит насмерть.

Мораль той басни...

О беззаконии, параличе судебной системы, беспределе правоохранительных органов говорится и пишется достаточно много. Некоторым кажется, что "бои без правил" идут только с оппонентами режима, однако если начинает править не сила закона, а закон силы, то рано или поздно беззаконие коснется всех. Данная история — только подтверждение этого печального факта.

Ирина МАЛЬЦЕВА.

ВІНШУЕМ!

Хадыка падманвае свае гады

23 чэрвеня адзін са стваральнікаў і лідэраў БНФ, прафесар Юры Хадыка адзначыў 70-годдзе. Напэўна, Юрась Віктаравіч жыве не па юрыдычным, а па нейкім сваім унутраным календары, бо проста немагчыма паверыць, што ў гэтага жвавага, энергічнага і яскравага чалавека ўжо такі сур'ёзны ўзрост.

Юрась Хадыка працаваў у Інстытуце фізікі Акадэміі навук Беларусі. Кіраваў лабараторыяй, якая разлічвала траекторыі ракет, секцыяй оптыка-электронных сродкаў выведкі, у камісіі АН СССР па распрацоўцы прагнозу развіцця ўзбраенняў. Доктар фізіка-матэматычных навук. Тэма дысертацыі: "Аптычныя характарыстыкі факелаў балістычных ракет".

Адначасова Юры Хадыка абараніў кандыдацкую дысертацыю па мастацтвазнаўстве, стаў адным з ініцыятараў стварэння акадэмічнага музея старажытнай беларускай культуры. Напісаў каля 150 навуковых прац па фізіцы, каля 200 навукова-тэхнічных справаздач і амаль 40 публікацый па гісторыі беларускага мастацтва.

У 1988 годзе прыйшоў у дэмакратычны рух, праз год быў абраны намеснікам старшыні Партыі БНФ "Адраджэньне". За сваю актыўную грамадскую дзейнасць некалькі разоў быў за кратамі, амаль месяц трымаў бестэрміновую палітычную галадоўку.

Юрась Віктаравіч! Супрацоўнікі і чытачы "Народнай волі" шчыра віншуюць Вас з юбілеем! Жадаем і надалей падманваць гады!

Минжилкомхоз со следующего года на 25% повысит тарифы на воду

Минжилкомхоз планирует с 1 января 2009 года повысить тарифы на воду и водоотведение на 25%. Об этом сообщил министр жилищно-коммунального хозяйства Владимир Белохвостов.

"Мы планируем внести предложения до ноября 2008 года о повышении тарифов на воду и водоотведение на 25% и ввести их в действие с 1 января 2009 года", — сказал Белохвостов. По его словам, это связано с ростом цен на энергоносители. *"Нет практически ни одного вида продукции, который в настоящее время не зависел бы от цены на газ, электроэнергию и другие энергоресурсы"*, — подчеркнул он.

В целом коммунальные услуги делятся на две части. К первой части относятся услуги, которые занимают основную долю в платежах (жировках) населения, — тепло, газ, электроэнергия. За эти услуги несет ответственность Минэнерго, оно формирует цены и согласует с Минэкономики. Ко второй части (чисто жилищно-коммунальным услугам) относятся вода, водоотведение, техническое обслуживание и прочие услуги. По словам Белохвостова, до конца 2008 года по этим видам услуг повышение цен не предполагается.

Дополнительный телефонный номер справочной службы автовокзала

К сезону отпусков филиал "Минский автовокзал" в связи с загруженностью единой внутренней справочной службы 144 (за сутки сюда поступает около шести тысяч звонков) добавил еще один номер — 8-902-101-41-14.

Гаспадар пачынае напружана лічыць. "Пяць," — гаворыць і твар яго скрыўляецца ў незадаволеную грымасу. Паказвае вялікі палец уніз. Далей размова не была настолькі канструктыўнай з-за адсутнасці ведання агульнай мовы. І я пайшла гуляць па Гаване.

Кубінская шчырасць і "бясцэнныя" грошы

Што я адразу прыкмеціла, пагуляўшы па Гаване, — кубінцы вельмі шчырыя і адкрытыя. І, нягледзячы на сваю галечу, спакойна ставяцца да таго, што іх фатаграфуюць. І большасць не тое што пазіруе, а проста без усялякіх эмоцый глядзіць у аб'ектыў. Нібы нічога не адбываецца.

Яшчэ: ці то ад пастаяннай спякоты, ці то ад таго, што жыхары вострава Свабоды вельмі шчырыя і адкрытыя, яны не баяцца паказваць сваё прыватнае жыццё навыварат. Гуляючы па вузкіх вуліцах Гаваны, раз-пораз заўважаеш людзей у расчыненых дзвярах сваіх кватэр. У іх няма калідораў, таму дзверы з вуліцы вядуць адразу ў пакой. І там бачна, як людзі сядзяць на канапах і крэслах-качалках і глядзяць тэлевізар. Некаторыя выходзяць на ганак і садзяцца адразу ж у дзвярах у піжаме, каб пачытаць свежы выпуск мясцовай газеты "Granma".

— Ола! — вітаецца з намі мінак на вуліцы.

— Ола! — адказваем мы. І, стомленыя ад пастаяннай увагі кубінцаў, працягваем ісці далей.

— Ну чаму ніхто са мной не хоча размаўляць? — даганяе нас мужчына.

— Усё, што мне кажуць турысты, гэта "Ола і ола"! А я хачу проста паразмаўляць! Мне больш нічога не трэба. Мне брат з Маямі штомесяц 300 долараў дасылае. У мяне ўсё ёсць. Я толькі паразмаўляць хачу...

Насамрэч, без такой дапамогі з-за мяжы выжыць на Кубе амаль немагчыма. На востраве дзве валюты. Адна для турыстаў — CUC (Cuban Peso Convertible), другая для кубінцаў — Peso Cubano (іх яшчэ называюць "драўлянымі"). Калі быць дакладным, то адзін CUC роўны 1,4 долара і 0,9 еўра. Таму кубінцы, што працуюць з турыстамі, могуць называць цану ў еўра, што, у прынцыпе, тое ж самае, што CUC. У Гаване, цэнтрах правінцый і курортах існуюць спецыяльныя крамы для турыстаў, у якіх цэны пазначаныя ў CUC.

Самі ж жыхары Кубы атрымліваюць зарплату ў Peso Cubano. І ў асноўным прадукты купляюць менавіта за гэтую валюту. У кубінскіх крамах немагчыма купіць амаль нічога. Часам пабачыш вялізную чаргу ў краме, падыдзеш паглядзець, што ж там такое прадаюць. А там — асадкі, запальнічкі, усякая драбяза...

Адзін кубінскі песа каштуе ўсяго амерыканскі квотэр — чвэрць долара. Дый купіць за гэтую валюту нельга амаль нічога. Да нас падышла жабрачка. Працягвае руку і просіць грошы на ежу. Пэр дастаў з кішэні 3 кубінскіх песа. Жабрачка зірнула на іх і кінула назад. "Дайце іншыя грошы, — кажа. — На гэтыя я не пад'ем".

Ёсць крамы і для заможных кубінцаў, дзе можна расплачвацца ў CUC. Гэта так званыя шопінгі. Выбар там значна большы, чым у звычайных крамах для кубінцаў. Але таксама там можна знайсці далёка не ўсё. Дый выглядаюць яны па-саўковаму. Побач з мэбляй прадаюцца макароны, побач з яблыкамі паадзінкава — шампуні...

Нярэдка на вуліцы можна сустрэць людзей, якія штосьці прадаюць. І звычайна рэчаў на продаж яны выстаўляюць пару штук. Гэта можа быць адно манга, адна цыгара, дзве запальнічкі і адна асадка. За ўвесь час, што я была на Кубе, я ні разу не бачыла, каб у іх хтосьці што-небудзь купляў. Аднак яны сядзяць так цэлымі днямі...

Кубінскія СМІ, інтэрнет і журналісты

З незалежнымі кубінскімі журналістамі мы сустрэліся ў невялічкай і беднай кватэры дзесьці на ўскраіне Гаваны. Іх было сем чалавек. Многія з іх хаця б дзень правялі ў турме. Усе яны згубілі працу і не могуць працаваць не тое што па спецыяльнасці, а ўвогуле ніяк. Адзінае, за што яны жывуць, — гэта артыкулы, якія пішуць у інтэрнеце і ў замежных СМІ.

Яны маюць свой блог. Абнаўляюць яго кожны чацвер у нідэрландскай амбасадзе. На гэта ў іх усяго дзве гадзіны. Але і гэтага дастаткова, калі ўлічыць, што больш ніякай магчымасці зайсці ў інтэрнет няма. Самі журналісты жартуюць: чым менш часу на інтэрнет, тым рацыянальней яны яго выкарыстоўваюць.

Старонкі з блогу журналісты раздрукоўваюць у тых жа амбасадах, а потым раздаюць. Робяць гэта пад пагрозай дзесяткаў гадоў турмы. Ад 3 да 15 год можна атрымаць за варожую прапаганду і ад 8 да 25 год за незаконны друк.

Тэарэтычна інтэрнетам на Кубе можна яшчэ пакарыстацца ў гатэлях ці на пошце. Але гэтая забава хутчэй для турыстаў. Большасці звычайных кубінцаў яна проста не па кішэні. Інтэрнет каштуе 6—9 долараў за гадзіну. А сярэдняя зарплата на востраве Свабоды — 480 кубінскіх песа, гэта каля 17 долараў. Аддаваць палову заробку за гадзіну інтэрнета?..

Аднак нават багатым турыстам не заўсёды можа пашчасціць знайсці інтэрнет. Могуць скончыцца карткі, паламацца антычныя камп'ютэры... А знайсці usb-порт на кубінскіх камп'ютэрах амаль немагчыма.

Афіцыйная прэса на Кубе — гэта дзве асноўныя нацыянальныя газеты і правінцыйныя. Ёсць некалькі забаўляльных і каталіцкіх выданняў. Газета "Granma" працягвае друкаваць лісты Фідэля Кастра. Напрыклад, ягоны ліст пра звальненне міністра адукацыі называецца "Жывыя і мёртвыя". У лісце Кастра тлумачыць, чаму звольнілі міністра — яму больш нельга давяраць, за 10 год ён пабываў за мяжой 70 разоў. А ў апошнія тры гады ён ездзіў за мяжу раз на тры месяцы. І заканчваецца артыкул словамі: "Я буду выказваць сваю сціплую думку, пакуль магу, і пакуль маю ў гэтым патрэбу. Мы, жывыя і мёртвыя, будзем працягваць змагацца!"

Ніводны нумар газеты "Granma" не абыходзіцца без аблайвання ЗША і Джорджа Буша ў прыватнасці. Тое самае і на кубінскім тэлебачанні. Большасць перадач палітычныя. Астатні час займае музыка, часта нізкапробнае кіно і серыялы краін Лацінскай Амерыкі.

Чытаць і глядзець такое кожны дзень надакучыла нават кубінцам. Таму айчынныя СМІ яны выкарыстоўваюць у асноўным для таго, каб даведацца пра вынікі спартыўных чэмпіянатаў. Хаця, варта сказаць, серыялы ў іх вельмі папулярныя. Вяртаючыся вечарамі ў сваю casa particular, я ледзь не ў кожнай кватэры бачыла на экранах тэлевізараў адзін і той жа серыял. Некаторыя кубінцы прызнаваліся — так, адно лайно па тэлебачанні. Але ж больш нічога няма...

Насамрэч, ёсць яшчэ незалежнае радыё, якое вяшчае з Маямі. Гэта радыё "Марці" і радыё "Рэспубліка". Аднак далёка не ўсе кубінцы ведаюць пра гэтыя СМІ. У канцы 80-х — пачатку 90-х на Кубе трансліравалася радыё для турыстаў. І мясцовыя жыхары лавілі сігнал. Таксама з дапамогай самаробных антэн лавілі з Маямі музычныя ды іншыя забаўляльныя каналы. Аднак рэжым вынішчыў усе антэны.

Вось, да прыкладу, у журналісткі Амарыліс такая антэна была. І неяк да яе прыйшлі людзі ў цывільным і загадалі антэну прыбраць, маўляў, ЗША скардзяцца, што Куба крадзе ў іх сігнал.

Адзін з нашых знаёмых кубінскіх журналістаў — Хуан Гансалес — някепска размаўляе па-англійску, прайшоў курсы. Ён пачаў скардзіцца, што не можа патрапіць за мяжу. Але верыць, што сітуацыя зменіцца.

— Калі? — пытаюся.

— Just the day before I die, — адказвае ён мне.

— А куды б вы хацелі паехаць перш за ўсё?

— У Новы Арлеан. Дзе толькі віскі і джаз. Буду піць віскі, слухаць Ролінг Стоунз... Калі ласка, Мік Джагер, не памірай, дачакайся мяне...

Нейкае ўяўленне журналісты мелі і пра Беларусь. Аднак папрасілі расказаць, як журналістам працуецца ў нас. Калі я расказвала, бачна было, як яны суперажываюць, і што ім шмат чаго знаёма. Але пасля майго расповеду адзін з іх — Луіс Піно — задумліва сказаў:

— Спадзяюся, і ў нас калі-небудзь будзе так, як у вас. У вас хаця б інтэрнет ёсць...

Кубінскія мабільнікі, камп'ютэры і прастытуткі

Амарыліс хваліцца сваім новым мабільным. Гэта яе першы тэлефон. Якраз за тры дні да нашага прыезду ў востраў Свабоды кубінцам дазволілі мець мабільныя (раней імі карысталіся толькі спецслужбы і прыбліжаныя да ўлады). Таксама стала магчымым купляць DVD-плэеры, крыху пазней — камп'ютэры. І, нарэшце, кубінцам дазволілі заходзіць у гатэлі для турыстаў. Раней усё гэта было забаронена.

Аднак большасць кубінцаў скептычна ставіцца да гэтых "дэмакратычных" змен. І не дзіўна. Дазволіць сабе купіць камп'ютэр ці мабільны— могуць адзінкі. Дый тое, толькі тыя, хто мае грашовую падтрымку з-за мяжы.

У Гаване ёсць чатыры офісы, якія прадаюць мабільныя. Сам апарат каштуе 70 CUC, падключэнне — 111 CUC, сім-картка — 10 CUC. Хвіліна размовы каштуе 50 сэнтава за хвіліну. Кубінскія заробкі вы памятаеце. 17 долараў. Тэлефоны, дарэчы, купляюцца па ID (картках асобы). Потым прасцей праслухоўваць. На кубінскім тэлебачанні часам нават даюць паслухаць запісы размоў "ворагаў рэжыму" з замежнымі сябрамі.

Камп'ютэры на Кубе каштуюць каля 800 долараў. З такой цаной і такімі зарплатамі ўвогуле становіцца незразумелым сэнс дазволу на продаж. Хаця, калі для карцінкі, то чаму б і не?

Затое да новаўвядзення, якое дазваляе кубінцам заходзіць у гатэлі, там ставяцца хоць і з жартам, але станоўча. "Цяпер наша эканоміка падымецца, — жартуюць яны. — Такім прыгожым дзяўчатам, як нашы, ніводны турыст не адмовіць".

Дарэчы, наконт прыгожых дзяўчат, якія падымаюць кубінскую эканоміку. Іх там сапраўды шмат. Нават да мяне адна падыходзіла. Хаця каштуюць яны не так танна, як пра гэта думаюць за мяжой. Кожны вечар, калі мы з Сарай ужо ішлі спаць, Пэр працягваў свой дзень у кубінскіх барах. А пасля на раніцу распавядаў, як бавіў час. І кожны раз у яго аповедзе было пра сустрэчы з прастытуткамі.

Калі вы адзіны белы мужчына ў бары, то вам не абмінуць сустрэчы хаця б з адной дзяўчынай. Яна кліча патэнцыйнага кліента "пссс-пссс" (дый зрэшты, на Кубе ўсе так клічуць адно аднаго, нават кліенты афіцыянтаў ці журналісты рэспандэнтаў). Потым прастытутка заводзіць размову: "Ты адзін? Хочаш пазабаўляцца?". Калі адкажаце ёй: "Не, дзякуй", — яна спытае: "Ты што, не мужчына?" Некаторыя адразу бесцырымонна просяць пачаставаць іх махіта, а затым прапануюць пайсці да іх і паслухаць музыку.

Калі спытаць дзяўчыну лёгкіх паводзін, чаму яна працуе прастытуткай, яна можа абразіцца. Маўляў, яна проста хоча прыемна правесці ноч. Але ў той жа час відавочна дае зразумець, што за гэтую прыемную ноч з ёй вы мусіце заплаціць.

На Кубе можна сустрэць два тыпы прастытутак. Адны — з яркім макіяжам і сексуальным адзеннем, так бы мовіць, прафесіяналкі. Другія — сарамлівыя дзяўчаты, якія днём працуюць нянькамі ці настаўніцамі, а вечарам зарабляюць сваім целам.

Як слушна заўважыў Пэр, мужчыны на Кубе прадаюць цыгары, жанчыны — сваё цела. І ўсё для таго, каб выжыць.

(Заканчэнне будзе.)

Віталіна ГРАХОЎСКАЯ,
(Еўрапейскае радыё для Беларусі).



Народная Воля http://www.nv-online.info
2 ЛІПЕНЯ 2008 г.

БЛІЦ

Каго вы лічыце самай значнай фігурай беларускай гісторыі?

У Расіі праходзіць конкурс "Імя Расіі", закліканы выявіць самую значную фігуру расійскай гісторыі па меркаванні жыхароў краіны.

"Народная воля" пацікавілася, хто можа прэтэндаваць на званне самай значнай гістарычнай фігуры Беларусі.

Артур КЛІНАЎ, пісьменнік, выдавец часопіса "пARTызан":

— Вылучыць кагосьці аднаго амаль немагчыма, таму што кожная эпоха і кожная сфера жыцця мае не адну выбітную асобу. Для мяне асабіста, калі казаць пра гісторыю менавіта Беларусі, а не княства Літоўскага, самай значнай з'яўляецца постаць Івана Луцкевіча. Ён быў адной з тых культавых асоб, дзякуючы каму стала магчымым абвяшчэнне назалежнасці Беларусі ў 1918 годзе. Без гэтага не было б ні БССР у складзе Савецкага Саюза, ні нашай сённяшняй незалежнасці.

Анастасія ЦЫМАНОВІЧ, прэс-сакратар Вярхоўнага суда:

— Еўфрасіння Полацкая.

Юрый ГІЛЬДЗЮК, мастацкі кіраўнік Беларускай дзяржаўнай філармоніі:

— Першым чынам гэта пясняр Беларусі Янка Купала, наш першадрукар Францыск Скарына, найярчэйшыя прадстаўнікі нашай літаратуры Максім Багдановіч, Уладзімір Караткевіч і Васіль Быкаў. З кампазітараў магу вылучыць Яўгена Глебава і Анатоля Багатырова, сярод дырыжораў — Юрыя Яфімава, Віктара Дуброўскага.

Вера ПАШКОЎСКАЯ, гаспадыня атэлье "Андарак":

— Францыск Скарына.

Кірыл ВАЛОШЫН, намеснік дырэктара УП "Надежные программы":

— Тут не фігура, а цэлая каманда — беларускіх баскетбалістак, якія летась ускалыхнулі наш спорт сваім трэцім месцам на міжнародным турніры, а ў гэтым перамаглі бразільскую каманду, падарыўшы аматарам спорту надзею на магчымы прыз на Алімпіядзе.

А калі сур'ёзна, я мог бы вылучыць Марка Крочыла, мастака і паэта з беларускімі каранямі, які стаў адным з найвялікшых прадстаўнікоў авангарду XX стагоддзя.

Аляксандр АРХІПАЎ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў:

— Прэзідэнт... На кожным этапе развіцця грамадства ёсць свае гістарычна значныя фігуры. Таму адназначна кагосьці аднаго вылучыць цяжка. Мы можам адказваць толькі пра час, у якім жывём.

Антаніна ГУБІЧ, кіраўнік прэс-цэнтра Канстытуцыйнага суда:

— Калі гаварыць пра асветнікаў, то я бы назвала Францыска Скарыну і Еўфрасінню Полацкую. Трэба ўспомніць і песняроў беларускай зямлі Янку Купалу і Якуба Коласа. А што тычыцца сучаснай гісторыі, то нельга забыцца пра асобу Пятра Машэрава і цяперашняга нашага кіраўніка дзяржавы.

Уладзімір ПУГАЧ, лідэр групы "J:морс":

— Князь Рагвалод Полацкі. Таму што па сутнасці гэта першы збіральнік земляў вакол Полацкага княства — першага беларускага агменю дзяржаўнасці.

Анатоль ПАЎЛАЎ, былы прарэктар БДУ:

— Кірыл Мазураў. Калі Хрушчоў пачаў знішчаць хатнюю скаціну, Мазураву хапіла мудрасці і мужнасці супрацьстаяць гэтаму. У той час гэта быў вельмі сур'ёзны крок. Дзякуючы яму наша рэспубліка ў СССР была адной з самых сытых. Нельга не ўспомніць Пятра Машэрава, які быў саюзнікам Мазурава. У іх час наша рэспубліка развівалася. І вельмі шкада, што, калі Савецкі Саюз развальваўся, у нас на чале партыі не было людзей маштабу Мазурава або Машэрава. Думаю, менавіта таму мы так "кульнуліся".

Вольга ПРУДНІКАВА.

АНОНС

Что для японцев сакура, то для белорусов картофель

5—21 сентября в художественной галерее "Университет культуры" пройдет выставка проекта "Арт-бульба", приуроченная к Международному году картофеля.

Проект поддерживает Представительство Организации Объединенных Наций в Республике Беларусь, которое и объявило 2008 год Годом картофеля.

"Основная идея, которую ООН хочет донести до людей: картофель — лучшее средство борьбы с голодом, — говорит Денис Барсуков, организатор выставки, директор художественной галереи "Университет культуры". — *Однако белорусам голод не грозит, потому мы решили этот гуманитарный посыл реализовать в виде художественного проекта".*

Главная цель проекта — художественными средствами живописи, фотографии, скульптуры отобразить такую часть материально-культурной жизни белорусов, как картофель, привлечь к нему внимание *"как к пищевому продукту, так и предмету художественной мысли".*

Чтобы в сентябре было чем порадовать посетителей галереи, уже сейчас идет работа с участниками проекта.

"Мы приглашаем нестандартно мыслящих, обладающих чувством юмора фотохудожников, дизайнеров, живописцев, скульпторов, — заявляет Денис Барсуков. — *Предложить свои работы может любой желающий. Жесткого отбора не будет. Но и просто фото картофельного поля произведением искусства не назовешь. Нужно, чтобы работа была сделана профессионально и несла в себе определенную идею, художественную ценность. Формат нашего мероприятия предполагает участие молодых креативных художников, которые могут представить картофель в виде арт-объекта".*

Беларусь стоит на первом месте в мире по потреблению картофеля. Организаторы проекта "Арт-бульба" даже утверждают, что для Беларуси картофель — это не просто продукт питания, а отличительная черта страны.

"Сезонные посадки, выкапывание картофеля, борьбу с колорадским жуком мы видим не как сельскохозяйственные работы, а как эстетическое действие, — замечает Денис Барсуков. — *Это можно сравнить с японским всенародным любованием цветущей сакурой. В Японии — сакура, а у нас — картофель".*

Ольга ПРУДНИКОВА.

НОВЫЯ ІМЁНЫ

Дарыя (Даша УРЫЗЧАНКА):

«Хачу быць не папулярнай, а любімай спявачкай...»

Маладая спявачка Дарыя, якая выконвае галоўную жаночую ролю ў мюзікле "Байкер", у эксклюзіўным інтэрв'ю "Народнай волі" распавяла аб сваіх адносінах з Русланам Аляхно, аб знаёмстве з Лаймай Вайкуле і выпадках, калі артысту проста неабходна "ўключаць зорку".

Аб працы ў мюзікле

— Даша, ты выконваеш галоўную жаночую ролю ў мюзікле "Байкер". У цябе зараз, напэўна, няма ні хвілінкі вольнага часу?

— Вядома, мюзікл і ўсё, што з ім звязана, адымае львіную частку майго часу. Да таго ж я не закінула сваю пеўчую дзейнасць. Пэўна, гэта можа здацца дзіўным, але я вяду свой інтэрнет-дзённік, які стала абнаўляю. Бывае, нешта вельмі ўсхвалюе, дык тады размяшчаю свае думкі ў сусветнай павуціне.

— Што для цябе значыць удзел у мюзікле: магчымасць зарабіць грошай, праявіць сябе, самавыражэнне або нешта іншае?

— Гэта магчымасць адкрыць сябе. Мне цікава сумяшчаць свой талент актрысы і спявачкі.

— У апошні час ходзіць вельмі шмат чутак з нагоды таго, што ты і спявачка Венера іграеце галоўную жаночую ролю пад фанаграму, запісаную Юліяй Гусевай... Гэта праўда?

— *(Тут Даша нават папярхнулася.)* Можа, яшчэ скажуць, што па сцэне ходзіць галаграма Дарыі? *(Смяецца.)* А ад чаго ў мяне тады паразлазіўся абутак пасля спектакля? Усё настолькі ўжывую...

— А як прайшла прэм'ера ў Гродне?

— Выдатна, я нават такога не чакала. На апошніх эпізодах у зале быў чутны плач. У мяне таксама наварочваліся слёзы. Але мне трэба было ісці на сцэну.

Аб заваяванні сталіцы

— Наколькі я ведаю, ты нарадзілася ў правінцыйным горадзе Слуцку, вучылася ў Маладзечне... Як аказалася ў Мінску? Табе, можа, хтосьці дапамог?

— Не, мне абсалютна ніхто не дапамагаў. Я вучылася ў музычным вучылішчы ў Маладзечне, потым працавала ў дзіцячай музычнай школе. Але марыла паступіць у сталічную ВНУ. Я кожны дзень па графіку вывучала тое, што ў мяне было запланавана. А пасля таго, як адна дзяўчына мне заявіла: "Кінь ты гэтую дурную задуму! Хто ў цябе бацькі? Супакойся і спакойна працуй у гэтай школцы", — я зразумела, што абавязкова паступлю у Мінск. *(Тут Даша раптам пачынае спяваць песню Білана "Немагчымае магчыма".)* У Мінск я ехала на электрычцы раніцай, дачытвала творы па рускай літаратуры. Мая непахіснасць трохі пахіснулася, калі я ўбачыла вялізную колькасць жадаючых паступіць. Але я ўсё-такі вытрымала выпрабаванні і паступіла. Потым была вучоба ў Мінску. Ніколі не разменьвалася на падзаробкі ў рэстаранах. Мне заўсёды было цікава хадзіць на ўсе лекцыі. Я прытрымлівалася слоў Пастэрнака: *"Во всем мне хочется дойти до самой сути..."*

— А як ты трапіла ў прадзюсерскі цэнтр "Спамаш"?

— Акрамя вучобы, я выступала ў некаторых праектах, удзельнічала ў конкурсах. І мяне запрасілі на праслухоўванне ў цэнтр. І са мной падпісалі кантракт. Ужо прайшло каля двух гадоў...

— Не так даўно са "Спамаша" сышла Юля Гусева, з якой абяцалі зрабіць суперзорку. Але гэтага не атрымалася. Ты не баішся, што і з табой так адбудзецца?

— Я думаю, што трэба быць рэалістам і трохі ідэалістам. А ўвесь астатні час шмат працаваць, каб чагосьці дасягнуць. Узяць таго ж народнага артыста Расіі Сяргея Макавецкага, які вельмі доўгі час працаваў у тэатры ім. Вахтангава, каб стаць тым, кім ён стаў. Таму я лічу, што ў кожнага чалавека ёсць свой унутраны гадзіннік. Калі трэба будзе, усё прыйдзе. І не трэба мітусіцца, хвалявацца або баяцца, што ў цябе раней часу з'явяцца ўзроставыя маршчыны. Трэба проста рабіць сваю справу. І рабіць гэта добра, пераканаўча... І ў канцы канцоў усё атрымаецца. Паула Казэльё пісаў у сваёй кнізе "Пятая гара": *"Калі-небудзь я дастукаюся да цябе, і табе прыйдзецца благаславіць вынікі маёй працы".* Я не веру ў імгненны поспех, асабліва ў наш час. Я веру ў феномен Раберціна Ларэцці або таго ж Вярцінскага. Але гэта ўсё было ў іх час.

— Табе не здаецца, што, вобразна кажучы, ты засядзелася на месцы як спявачка? Пачынаючай спявачкай цябе не назавеш... Можа, варта думаць ужо пра новыя гарызонты?

— Не, я не лічу, што засядзелася. У кожнага артыста свае гарызонты.

Аб планах на будучыню

— Не так даўно ты заяўляла, што ў цябе ёсць планы напісаць беларускамоўную песню, сыграць галоўную ролю ў мюзікле і спець сумесна з арт-групай "Беларусы"... Галоўную ролю ты ўжо сыграла, а як жа ўсё астатняе?

— Ты так сказаў "заяўляла", быццам бы я суперзорка... *(Смяецца.)* Я не магу сказаць, што я сыграла. Нельга сказаць, што сыграла адзін раз — і ўсё... Гэта пастаянны працэс, заўсёды ідзе ўдасканаленне. Аб сумеснай песні з арт-групай "Беларусы" гаварыць пакуль яшчэ рана. Зараз для мяне важней за ўсё мюзікл. А беларускамоўную песню абяцаю, што пачуеце.

— А калі мы пачуем і ўбачым твой першы сольны дыск?

— Складана сказаць... Як кажуць, чалавек мяркуе, а Бог распараджаецца... Можа быць, да канца гэтага года. Усё залежыць шмат у чым ад падрыхтаванага матэрыялу. Думаю, што варта больш сур'ёзна прызадумацца аб гэтым...

Аб конкурсах

— Гавораць, што ў Маскве на конкурсе "Народны артыст-2" ты больш за ўсё пасябравала з земляком Русланам Аляхно, які і перамог. А як зараз складваюцца вашы адносіны? Маеце зносіны, калі ён прыязджае ў Мінск?

— Не, зараз мы практычна не маем зносін. Калі толькі па працы перасякаемся. У кожнага свая дарога.

— У 2002 годзе ты атрымала дыплом III Міжнароднага конкурсу песні аб'яднанай Еўропы "Зялёна Гура". А зусім нядаўна заслужаная артыстка Беларусі Ірына Дарафеева стала ўладальніцай Гран-пры Першага фэста расійскай песні, які праходзіў у гэтым жа горадзе. Як ты думаеш, чаго табе тады не хапіла для перамогі?

— Справа ў тым, што гэта трохі розныя конкурсы. Праўда, мы выступалі на адной і той жа сцэне, толькі ў розныя гады. Не хачу параўноўваць сябе з Дарафеевай, вырашаць, што ёсць у яе, а чаго няма ў мяне. Справа ў тым, што ў артыстаў павінен быць добры менеджмент, як у любога тавара. А на той момант я была студэнткай другога курса.

— Даша, сёлета на "Славянскі базар" едзе твой калега па цэху Віталь Гардзей. Ты сама летась была сярод прэтэндэнтаў... Ёсць жаданне паехаць у наступным годзе на конкурс, ці табе гэта ўжо не цікава?

— Усё залежыць ад таго, ці будзе ў мяне добрая песня. А чаму б і не? Павінна ўсё сысціся. Летась я была яшчэ не гатовая. Гэта як у возеры бывае двайное дно. Я зразумела, што пакуль мне рана, адкрыла ў сабе яшчэ нейкі запас трываласці.

Пра характар, лёс і матэрыяльныя выгоды

— Даша, ты згодна з тым, што імя, якое даюць бацькі свайму дзіцяці, шмат у чым вызначае ў далейшым яго характар і лёс?

— Нешта ў гэтым ёсць. Нядаўна я бачыла па тэлевізары перадачу аб чалавеку, які жыве ў Расіі. Ён можа беспамылкова вызначыць па ініцыялах характар чалавека. Ён можа нават паўплываць на твой лёс.

— Добра, але паводле гэтай тэорыі дзяўчыны з імем Даша капрызныя, упартыя, шчырыя, ведаюць сабе цану патрабавальныя...

— Капрызнай я вырашыла стаць нядаўна. Не так даўно выступала ў Палацы моладзі, а там не вельмі добрыя ўмовы для жывога выступлення артыстаў. Аказалася, што няма нават грымёрнай. Мне сказалі пераапранацца за сцэнай. Як казаў Церкін, *"я не гордый, я согласен на медаль"... (Смяецца.)* Нічога не заставалася рабіць, як пераапранацца. Раптам прыходзіць Паліна Смолава. Яна тут жа стала высвятляць, дзе грымёрная. І заявіла, што калі не будзе грымёрнай, то з'едзе. Мяне гэта здзівіла да глыбіні душы. І гэта правільна, так павінен паводзіць сябе артыст. Бо артыст — гэта не мошка, якая круціцца і ўсіх весяліць... Будаўніку ж для працы патрэбныя прылады. Так і артысту... Таму я таксама вырашыла часам "уключаць зорку".

— Смолава з'ехала ў Маскву да мільярдэра. Чаму б і табе так не паступіць?

— Не ведаю, ці змагла б я паехаць, як Смолава. У мяне не той характар. Нядаўна адзін хлопец у мяне спытаў, чаму я не карыстаюся сваёй знешнасцю? Ды таму, што не магу. Ды і не ўмею гэтага рабіць. Я толькі нядаўна адкрыла ў сабе ўпэўненасць. У гэтым дапамагла Лайма Вайкуле, якая была ў складзе журы конкурсу "Народны артыст-2". Яна падышла да мяне і сказала: "Паслухай мяне, ты лепшая. Лепш за цябе ў гэтым праекце няма нікога! Разумееш? Усміхайся!" *(У Дашы так добра атрымалася спарадзіраваць вядомую спявачку, што на нас сталі звяртаць увагу людзі, якія сядзелі побач.)* Яна была першай, хто мне сказаў, што я чагосьці вартая. І я потым гэта сама зразумела.

— Даша, ты такая эфектная дзяўчына...

— *(Даша тут жа мяне перабівае.)* А можна пацікавіцца, што значыць "эфектная"?

— Незвычайная, неардынарная... Бо ў кожнай дзяўчыны павінна быць свая іскрынка...

— Ну чаму я аказваю ўражанне неардынарнай і незвычайнай дзяўчыны? Я ж прыйшла без "іракеза"... *(Смяецца.)*

— Скажы, а пагадзілася б ты толькі на ролю жонкі альбо палюбоўніцы? Навошта табе імкнуцца чагосьці дамагчыся?

— Чаго? *(Даша не стрымлівае свайго здзіўлення.)* Ды я сама каго заўгодна змагу ўтрымліваць. Няўжо цікава сядзець на адным месцы і разважаць, якая калекцыя сёння ў модзе. Я не той чалавек, у мяне іншае выхаванне, стаўленне да жыцця.

— Скажы, а які хлопец годны таго, каб знаходзіцца побач з табой? Чым ён павінен валодаць, што павінен умець рабіць, якім ён павінен быць?

— Матэрыяльны бок не самы галоўны ў адносінах. Як гаворыцца, багацце — справа нажыўная. Я лічу, што самае галоўнае — каб у мужчыны было пачуццё гумару, прастата, павага, разуменне таго, што адносіны — гэта кампраміс.

— Даша, а ў тваіх прыхільнікаў ёсць шанцы, або тваё сэрца ўжо занята?

— Шанцы заўсёды ёсць *(смяецца).* Мне прыйшлі на розум словы з нейкага твора: адказам на любое пытанне з'яўляецца каханне.

— Я гляджу, што ты начытаны чалавек...

— Гэта толькі першае зманлівае ўражанне *(смяецца).* Проста да мяне неяк самі прыходзяць кнігі. Зараз, праўда, мне не дазваляе час паляжаць у гамаку і пачытаць кнігу або даглядаць за кветкамі. Хоць я гэта вельмі люблю рабіць.

— Ты любіш даглядаць расліны?

— Так, мне гэта падабаецца. Зараз у мяне ў планах ёсць адзін праект, звязаны з маёй любоўю да раслін. Мне цікавы ландшафтны дызайн, хачу рэалізаваць свае ідэі ў жыццё. Мая сяброўка, напрыклад, па адукацыі музыкант, але пры гэтым сама асвоіла прафесію дызайнера. Мне гэта таксама блізка.

— Можа, хутка ў Мінску з'явіцца фірма па распрацоўцы дызайну ад спявачкі Дарыі?..

— Пакуль я над гэтым пытаннем не задумвалася... Я проста гаварыла аб праекце, а ты мне тут жа адразу гаворыш пра бізнес... Усё табе кватэры, машыны, бізнес нейкі... *(Смяецца.)* Я не думала аб гэтым. Праўда, можна было б кветкавую краму адкрыць...

— Даша, а што, па-твойму, значыць быць вядомым, папулярным?

— Ведаеш, я не лічу сябе папулярнай. Для мяне бліжэй слова "любімая". Гавораць жа, напрыклад, "любімая спявачка". Я, у адрозненне ад многіх дзеячаў шоу-бізнесу, ніколі не хвалю сябе, не набіваю сабе цану. Я звычайны чалавек. Хоць іншы раз я разумею, што не пашкодзіла б кагосьці паставіць на месца.

Дзмітрый БАБРОЎСКІ.

СЛЫШАЛИ?

Михаил Финберг получит 112 тысяч долларов

На XVII Международном фестивале искусств "Славянский базар в Витебске" **Михаилу Финбергу** будет вручена премия союзного государства.

Об этом сообщил "Народной воле" госсекретарь союзного государства **Павел Бородин.**

По словам заместителя госсекретаря союзного государства **Сергея Шухно**, размер премии составляет 112 тысяч долларов.

Премии также получат Владимир Гостюхин и **Александра Пахмутова**.

ОФИЦИОЗ

Окупается ли «Славянский базар»?

Фестиваль "Славянский базар в Витебске" финансируется из "резервного фонда президента". Об этом сказал журналистам первый замминистра культуры Беларуси Владимир Рылатко.

Откуда деньжата?

"На одну треть бюджет фестиваля состоит из средств, выделенных постоянным комитетом Союзного государства, — *рассказал В.Рылатко.* — Большую поддержку оказывает А.Лукашенко: "Славянский базар в Витебске" устойчиво финансируется Резервным фондом президента. Но фестиваль окупает себя и сам. Если раньше средств, вырученных от продажи билетов, хватало на покрытие едва ли одной десятой затраченного, то сейчас "Базар" зарабатывает одну треть — порядка 3 миллиардов белорусских рублей".

Только этого мало...

Политик Павел Бородин считает, что на финансирование "Славянского базара в Витебске" из бюджета так называемого Союзного государства можно было бы потратить больше денег. И это несмотря на то, что в этом году на фестиваль уже выделено больше миллиона долларов (25 миллионов российских рублей).

"Бюджет Союзного государства за последние годы вырос в 8 раз, — *говорит Бородин.* — Я просил, чтобы его увеличили еще на несколько миллиардов — эти средства могли бы пойти и на увеличение спонсирования "Славянского базара". Но для этого нужно ратифицировать пять соглашений, подписанных нашими президентами в 2005 году. Первое из них — о собственности Союзного государства. Поймите, никто не станет разбирать таможенные пункты и пограничные заставы Беларуси, но нормативно-правовая база необходима для бюджета..."

Чужой кошелек

Исполнители предпочитают не разглашать суммы гонораров, полученных за участие в "Славянском базаре".

"Например, согласно контракту с одной французской звездой, выступавшей на "Славянском базаре", стороны не имеют права разглашать такие сведения раньше, чем через 15 лет, — *говорит чиновник со стажем Владимир Рылатко.* — Гонорары — дело людей, подписывающих контракт. У каждого свои условия договора, но большинство не желает, чтобы кто-то знал непосредственно суммы..."

Валерия ЕСИНА.

ШОУ-БИЗНЕС

«Если прямо сейчас начнем копить деньги, то замечательную трехкомнатную квартиру в Минске стоимостью около 100 тысяч долларов получат дети наших детей»

Участники группы "ДетиДетей" актеры Купаловского театра Анна Хитрик и Михаил Зуй ответили на несколько вопросов корреспондента "Народной воли" во время онлайн-конференции, проводимой порталом tut.by. Отвечая на вопросы, ребята все время отшучивались. Но, как говорится, в каждой шутке есть доля правды…

— В группе несколько профессиональных актеров, а не профессиональных музыкантов. Но тем не менее вы пользуетесь популярностью… В чем секрет успеха?

— **Анна Хитрик:** Актеров в группе трое. Остальные — профессиональные музыканты. Может, в них и успех?

— На ваш взгляд, в Беларуси есть достойные исполнители?

— **Михаил Зуй:** Исполнитель — достойный чего?

— Исполнители, которые могли бы стать мировыми звездами?

— **Анна Хитрик:** Конечно, есть. Чего мы только стоим!

— У группы "ДетиДетей" у нас в стране есть конкуренты?

— **Анна Хитрик:** Есть, детская сборная Беларуси по керлингу.

— На кого ориентировано творчество группы "ДетиДетей"? Можете нарисовать образ вашего слушателя?

— **Анна Хитрик:** "У яго вялізныя вочы, вельмі доўгія рукі і ненатуральна выцягнутая галава" — Уладзімір Караткевіч, "Дзікае паляванне Караля Стаха" (смеется).

— Каков основной источник дохода участников группы? Театр, шоу-бизнес, спонсорство…

— **Анна Хитрик:** Халтуры.

— А может ли артист или актер у нас в стране зарабатывать на достойную жизнь?

— **Анна Хитрик:** Наверное, может.

— Хорошо, тогда сколько лет участник группы "ДетиДетей" должен копить деньги на трехкомнатную квартиру в Минске стоимостью около 100 тысяч долларов?

— **Михаил Зуй:** Если мы прямо сейчас начнем копить деньги, то замечательную трехкомнатную квартиру в Минске стоимостью около 100 тысяч долларов получат дети наших детей.

— Разносторонние таланты участников группы не могут не поражать. Можно ли полагать, что в ближайшее время участники группы "ДетиДетей" снимутся в кино? Или запишут музыку для кинофильма?..

— **Анна Хитрик:** Все из нас снимаются в кино. На то мы и актеры. Недавно нашу песню "Холодильник" взяли в фильм "Двое под дождем" московского режиссера Алика Мурадова.

— Сегодня одним вокалом, хорошим пением очень сложно завоевать любовь слушателей, но у группы это хорошо получается. Не планируете ли ввести в свои выступления эффект шоу?

— **Анна Хитрик:** Конечно, планируем. Как только любовь зрителей будет нас покидать, то мы сразу начнем раздеваться *(смеется)*.

—Группе два года. Но вы выпускаете уже второй альбом. Многие исполнители о таком и не мечтают.

— **Анна Хитрик:** Просто очень хотелось. Работать надо.

— Когда ждать следующий альбом?

— **Анна Хитрик:** Скоро.

—Первый альбом окупился? Принес прибыль?

— **Анна Хитрик:** Первый альбом мы делали не одни — поэтому не можем отвечать на ваш вопрос.

—Аня, порой вы очень даже похожи на Пеппи…

—Анна Хитрик: А вы знали лично Пеппи? *(смеется)*.

Дмитрий БОБРОВСКИЙ.

БЖД ввела новые правила

Новые правила перевозок пассажиров и багажа железнодорожным транспортом общего пользования вступили в силу в Беларуси, сообщила пресс-служба БЖД.

Если раньше стоимость провоза мелких животных (кошек, собак), птиц и багажа была фиксированной, то сейчас она будет зависеть от стоимости билета пассажира. "Так, за провоз мелких животных и птиц будет взиматься плата со штуки или места в размере 0,5 стоимости пригородного билета до пункта назначения пассажира", — пояснили специалисты.

Провоз велосипеда в неразобранном и неупакованном виде обойдется владельцу в размере стоимости полного пригородного билета пассажира. Такую же сумму придется заплатить и за провоз сверхустановленной нормы дополнительной ручной клади весом до 50 кг.

ТРАГЕДЫЯ

Дапіліся

Жыхар Ляхавіцкага раёна застрэліў з паляўнічага ружжа свайго 33-гадовага сына, пасля чаго параніў сябе нажом.

Як паведамілі БелаПАН у пракуратуры Ляхавіцкага раёна, трагедыя адбылася ў вёсцы Свяціца. У двары дома 58-гадовы непрацуючы гаспадар і яго 33-гадовы непрацуючы сын, які пражываў з ім, распівалі спіртныя напоі. Падчас сваркі бацька выстраліў у сына з незарэгістраванага паляўнічага ружжа ТОЗ-БМ. У выніку агнястрэльнага ранення сын памёр на месцы. Пасля гэтага бацька спрабаваў скончыць самагубствам пры дапамозе кухоннага нажа. З пранікаючым нажавым раненнем левай часткі грудной клеткі ён змешчаны ў бальніцу, дзе яму была зроблена аперацыя. Медыкі ацэньваюць яго стан як стабільны.

З месца здарэння канфіскавана паляўнічае ружжо, сем паляўнічых патронаў і нож.

Пракуратурай Ляхавіцкага раёна распачата крымінальная справа па ч.1 арт.139 Крымінальнага кодэкса (забойства). Праводзіцца расследаванне.

Ларыса ШЫГАНАВА.

КРЫЖАВАНКА

Да 930-годдзя г.Лагойска. Я.Купала і Лагойшчына



Па гарызанталі: 5."Усю Беларусь - неаб'ятну, як мора,//ўбачыць у ясным, як сонца, святле". З верша Я.Купалы "Песня мая", напісанага ў Акопах у 1911 годзе. 6.Пашыральнік перадавых ідэй і ведаў, да якіх адносіцца і наш пясняр Я.Купала. 9.Лысая ... — адна з вышэйшых кропак на Беларусі паблізу Акопаў, па крутых схілах якой любіў гуляць Я.Купала. 10."Нават я не...//Што пяе так слаўна,//А я толькі верабейка,//ўзрошчаны пад Гайнай". З верша Я.Купалы "Я не сокал..." (1905—1907 гг.), напісанага ў Акопах. 11.Сімвал святасці — ззянне ў выглядзе круга вакол галавы. 14.Адмоўны персанаж сатырычнай камедыі Я.Купалы "Тутэйшыя", напісанай у Акопах у 1913 годзе. 17...-валун — вялізны кавалак горнай пароды ў Акопах, на якім, паводле легенды, любіў пісаць і адпачываць пясняр. 18."... аб кепскім гаспадару". Верш Я.Купалы, напісаны ў Акопах (1926 г.). 19.Юрый ... — беларускі графік і жывапісец, аўтар карціны "На радзіме паэта. Вязынка" і іншых. 20.Пра тое, што рассыпана (разм.). 23.Змястоўнасць (перан.). 25."Як сама ...//У залатой кароне,//Ідзе яна ў вяночку паміж спелых гоняў". З верша "Жняя" (Акопы, 1911 г.). 26."Як нябеснае згасне за лесам ...", з верша "З вячэрніх дум" (Акопы, 1913 г.). 29."Што родная ..., хоць бедная ...//Мілей найбагатшай чужой!" З верша "Роднае слова" (Акопы, 1908 г.). 31.Анатоль ... — беларускі кампазітар, прафесар, аўтар рамансаў і хораў на вершы Я.Купалы. Сёлета — 95 год з дня яго нараджэння. 32.Абмен адной рэчы на другую. 33.Верш, напісаны Я.Купалам у Пецярбургу (1912 г.). 34."Далёкай, нялёгкай сцяганы хадзьбой". З верша Я.Купалы "...", напісанага ў Акопах (1911 г.).

Па вертыкалі: 1."... аб палку Ігаравым". Помнік старажытнарускай літаратуры, перакладзены на беларускую мову Я.Купалам у Акопах у 1921 годзе. 2.Паэма-балада Я.Купалы (Пецярбург, 1910 г.). 3."Заклятая ..." Верш Я.Купалы (1909 г.) "Чуць толькі купальскае свята//Наблізіцца з ночкай сваёй". 4... Грыневіч. Выдавец, педагог, збіральнік беларускага фальклору, які разам з Я.Купалам у Акопах запісваў беларускія песні. 5.Тварэц, стваральнік (перан.). 7.Павел ... — беларускі акцёр-купалавец, выканаўца ролі Зябліка ў спектаклі па драме Я.Купалы "Раскіданае гняздо", напісанай у Акопах, і іншых. 8... Аўлачынская. Імя прататыпа Паўлінкі, якая жыла ў засценку Рубеж паблізу Акопаў. 12.Вёска на Лагойшчыне (Янушкавіцкі с/савет), дзе знаходзіцца філіял Літаратурнага музея Я.Купалы "Акопы". 13.Незакончаная гістарычна-патрыятычная паэма Я.Купалы, якую ён пісаў у Акопах. 15."На ...". Верш Я.Купалы (1910 г.) "На ... на святое//Рві, матуля, зелле тое". 16.Беларускі першадрукар, пісьменнік, асветнік. Я.Купала ў "Лісце да палачан" высока ацаніў яго дзейнасць. 21.Антон ... (псеўданім Крыніца) — беларускі акцёр, які сыграў ролю Зябліка ("Раскіданае гняздо") і Крыніцкага ("Паўлінка"). Сёлета — 110 год з дня яго нараджэння. 22.Назва злётаў-семінараў маладых паэтаў у Акопах. 24."Не шукай сабе, мой ...,//З ветрам Бацькаўшчыну-матку". З верша Я.Купалы "Не шукай" (Акопы, 1913 г.). 27."Як у лесе зацвіталі//Ліпы ды ...". З верша Я.Купалы "Як у лесе зацвіталі" (Акопы, 1911 г.). 28."Лясное ...". Верш Я.Купалы (Акопы, 1919 г.) "Дрэмле абсаджана лесам адвечным". 30.Гравюра на медзі або цынку. Пад назвай "Могілкі. Вёска Корань" яе выканаў беларускі графік і жывапісец Л.Ран. 32.Першы друкаваны твор паэта (1905 г.). "Што я ..., усе тут знаюць".

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.

г.Дзяржынск.

АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ, НАДРУКАВАНУЮ Ў №№69—70

Па гарызанталі: 5.Апалчэнне. 6.Куля. 7.Штык. 9.Морды. 10.Акладня. 12.Радзіма. 14.Вайна. 19.Камандор. 20.Каляндар. 21.Перамога. 22.Земляроб. 27.Фюрэр. 30.Лявонны. 31.Базальт. 32.Парад. 33.Мова. 34.Баёк. 35.Намаганне.

Па вертыкалі: 1.Цагліна. 2.Платонаў. 3.Рэзідэнт. 4.Пестрак. 6.Край. 8.Каза. 11.Кавалерыя. 13."Маладосць". 15.Знамя. 16.Зорге. 17.Лагер. 18.Зямля. 23.Бюракрат. 24."Рэпартаж". 25.Корм. 26.Жнівень. 28.Кавалер. 29."Танк".

ПАСЛУГІ

Прыём шклатары і іншая дапамога жадаючым.

Тэл. (8-033) 661-11-87 (МТС).

СТОЛИЦА

Максим возвращается

К 3 июля в сквере у Национального академического Большого театра оперы и балета в Минске планируется установить памятник классику белорусской литературы Максиму Богдановичу (09.12.1891—25.05.1917). Монумент будет расположен практически напротив дома, где он жил.

Как сообщил БелаПАН начальник производственно-технического отдела управления капитального строительства администрации Центрального района столицы Юрий Мазовка, сейчас ведется сооружение постамента для памятника и благоустройство окружающей территории в той части сквера, которая обращена к улице имени Богдановича и зданию Минского суворовского училища.

Монументальный образ Максима Богдановича был создан в 1981 году скульптором Сергеем Вакаром в сотрудничестве с архитекторами Леонардом Москалевичем и Юрием Казаковым. В течение 27 лет бронзовый памятник украшал площадь Парижской коммуны у здания театра оперы и балета, однако в апреле этого года был демонтирован.

В ответе заместителя министра культуры Владимира Гридюшко на запрос председателя Белорусского добровольного общества охраны памятников истории и культуры Антона Астаповича о причинах переноса монумента отмечается, что памятник включен в Государственный список историко-культурных ценностей Республики Беларусь. Вопрос о переносе памятника, находящегося на реставрации, "рассмотрен на совещании в ходе посещения театра оперы и балета президентом Республики Беларусь и одобрен главой государства", говорится в письме. Гридюшко также сообщает, что новое место установки памятника Богдановичу было определено 21 мая на заседании Белорусского республиканского научно-методического совета по вопросам историко-культурного наследия при Министерстве культуры.

Комментируя БелаПАН письмо Минкульта, Астапович заявил, что оно "официально засвидетельствовало нарушение законодательства со стороны чиновников". Статья 28 закона "Об охране историко-культурного наследия" разрешает перемещение недвижимых историко-культурных ценностей только по специальному разрешению правительства в случае катастроф, стихийных бедствий и военных действий, подчеркнул председатель общества охраны памятников.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Вы спазніліся з перадаплатай за нумары «Народнай волі» ў другім паўгоддзі? Ёсць яшчэ шанц...

Мы прасілі: не адкладвайце з афармленнем **перадаплаты** за нумары, якія будуць выходзіць у ліпені—снежні. Некаторыя ўсё ж упусцілі час. Рэдакцыя ідзе Вам насустрач: працягнула тэрмін аплаты. Вам толькі трэба завітаць у любы філіял "Беларусбанка" альбо ў любое паштовае аддзяленне і запоўніць бланк, узор якога мы друкуем у чарговы раз.

Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** таксама праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: **328-63-93** ці **328-68-71**. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць перадаплату за любы тэрмін. Не маеце магчымасці аплаціць за ўсе нумары другога паўгоддзя — зрабіце гэта за месяц, два, тры...

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, тарыфы па **перадаплаце** ранейшыя: на месяц — 9500 рублёў для індывідуальных чытачоў і 15.000 рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу з новага года павысіўся, то выгадна рабіць перадаплату, з тым каб газета дастаўлялася дахаты.

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з "Народнай воляй", "Народная воля" — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя **3012006535014** Лицевой счет **код 749**
УНН* 100961759

(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за апрель, май, июнь, июль				
август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь				
2008 г. *(ненужное зачеркнуть)*				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя **3012006535014** Лицевой счет **код 749**
УНН* 100961759

(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за апрель, май, июнь, июль				
август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь				
2008 г. *(ненужное зачеркнуть)*				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операций по уплате налогов.

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за апрель, май, июнь, июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г.
(ненужное зачеркнуть)

Заполняется отчетливо ***печатными буквами*** *и* ***обязательно*** *сверяется в редакции с* ***копией платежного документа***

фамилия

имя **отч.**

индекс почтового отделения

область

район

название населенного пункта

город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)

улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*

дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: если можете — укажите, пожалуйста, код подъезда или номер дом.телефона; в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 1.07.2008 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №